Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. СУБОТА № 203 (29825)

УЛАДЗІМІР КАНАПЛЁЎ: НЕАБЫЯКАВЫ ДА ГАНДБОЛА 4

ІДЗЕ ВЯЛІКАЕ КІНО 13

МІНСКІ МІЖНАРОДНЫ КІНАФЕСТЫВАЛЬ ЛІСТАПАД

КАРОТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў работнікам фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прамысловасці віншаванні з прафесійным святам.**
- Міжнародны студэнцкі алімпійскі форум адбыўся ў Мінску.
- **Рэспубліканская акцыя МНС «За бяспеку разам» стартуе ў Беларусі 17 кастрычніка.**

- Шырокая грашовая маса ў Беларусі за верасень павялічылася на 1,8 працэнта.
- **Праблемам невідушчых людзей нададуць павышаную ўвагу падчас месячніка ў Магілёве.**
- Індывідуальныя кансультацыі ўрачоў па здаровым ладзе жыцця можна атрымаць 15 кастрычніка ў Мінску. Выязная паліклініка пройдзе з 11.00 да 14.00 па вуліцы Чыгуначная, 138.
- **Пракуратура Брэсцкай вобласці выявіла факты неабгрунтаванай адмовы ў бясплатных леках дзецям.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ПЯРЦОЎ, міністр інфармацыі:

«Вынік патрыятычнага выхавання нельга вымераць, як у рэальным сектары эканомікі, — тонамі, кілаграмамі, адзінкамі...
Але яго вынік значна больш важны — гэта любоў да сваёй Радзімы, вялікай і малой, жаданне працаваць на карысць краіны і свайго народа, быць гатовым яе абараняць».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У НАС ЁСЦЬ УСЁ, КАБ МАКСІМАЛЬНА ЗНІЗІЦЬ НАШУ ЗАЛЕЖНАСЦЬ АД АГУЛЬНАСУСВЕТНЫХ УЗРУШЭННЯЎ І НЕДРУЖАЛЮБНЫХ КРОКАЎ АГРЭСІЎНА НАСТРОЕНЫХ ДЗЯРЖАЎ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, якое адбылося ў Астане. Удзельнікі сустрэчы абмяняліся меркаваннямі па актуальных праблемах Садружнасці Незалежных Дзяржаў, разгледзелі некаторыя арганізацыйныя пытанні. Па выніках пасяджэння кіраўнікі дзяржаў Садружнасці падпісалі шэраг дакументаў, накіраваных на развіццё шырокамаштабнага міждзяржаўнага супрацоўніцтва.

Фота БелТА.

«На трываласць будуць выпрабоўваць усіх»

Адкрываючы пасяджэнне, гаспадар саміту прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў адзначыў, што на разгляд Савета кіраўнікоў дзяржаў прадстаўлены важныя пытанні, якія датычацца гуманітарнага партнёрства, гарантавання бяспекі і іншых аспектаў нашага супрацоўніцтва.

Як звярнуў увагу падчас пасяджэння ў вузкім складзе Аляксандр Лукашэнка, на жаль, тое, аб чым мы так доўга гаварылі на працягу многіх гадоў, адбылося, стала рэальнасцю. «Супраць усіх нас развязана сапраўдная гібрыдная вайна, — заўважыў Прэзідэнт Беларусі. — І Украіна тут толькі падстава. Задумы асобных краін па рэваншы за прайграныя кампаніі мінулага стагоддзя выношваліся даўно, пачынаючы, як вядома, з першых дзён пасля Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а магчыма, і раней».

Па словах кіраўніка дзяржавы, на вастрыі эканамічных і фінансавых атак сёння знаходзяцца Расія і Беларусь. «Але, думаю, усе тут разумеюць, што сапраўдныя мэты заходніх стратэгаў значна шырэйшыя — расчляніць еўразійскую прастору па сектарах уплыву і выкарыстоўваць нашы краіны ў якасці сыравінных і прамысловых прыдаткаў, — патлумачыў ён. — Трэба быць гатовымі да самых разнастайных правакацый па ўсім перыметры СНД. Падзеі нядаўнія ў Казахстане, Узбекістане — пераканаўчыя і вельмі павучальныя прыклады. Але гэта толькі пачатак. На трываласць будуць выпрабоўваць усіх». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пакуль, на жаль, вымушаны канстатаваць адсутнасць у шэрагу выпадкаў узаемнай падтрымкі.

СТАР. 2

Сям'я года — 2022

«З АДНЫМ ДЗІЦЯМ ЦЯЖКА, А З ПЯЦЦЮ — НАШМАТ ЛЯГЧЭЙ»

Пераможцамі конкурсу «Сям'я года» сталі прадстаўнікі Брэстчыны

Фота БелТА.

Учора, у Дзень маці, у Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў прайшоў фінал V Рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года». У ім узялі ўдзел сем пераможцаў адборачных тураў з усіх абласцей Беларусі і Мінска. Арганізатарам выступіла Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Удзельнікаў і гледачоў павітала **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС,** дарэчы, сама шматдзетная маці.

— Хоць я і шматдзетная маці, у мяне ўсяго трое дзяцей, і гэта павінна стаць нормай для нашай краіны, — сказала яна. — Колькасць дзяцей вызначае якасць нашага жыцця. Чым іх больш, тым больш эмоцый, хоць не заўсёды станоўчых. Чым больш дзяцей, тым больш успамінаў і тым больш любові. Усё гэта дае адчуванне натуральнасці жыцця, па-беларуску кажучы, людскасці.

Конкурс «Сям'я года» праходзіць у Беларусі пяты раз, першы адбыўся ў 2012 годзе. Сёлета толькі ў адборачных этапах прынялі ўдзел 523 сям'і, 55 з іх змагаліся за выхад у фінал.

СТАР. 3

Спажывец

АПОШНЯЕ ПРЫВІТАННЕ МІНУЛАГА ЛЕТА

Як перайсці на «восеньскі рацыён» і не дадаць лішніх калорый

У пагодлівыя дні восеньскае сонца часам усё яшчэ прыпякае, але яго цяпло зманлівае: вечары халодныя, ды і раніцай ветрык прабірае да костак. І наш арганізм чуйна рэагуе на змену сезонаў. Зялёныя салаты больш не насычаюць — хочацца нечага гарачанькага і каларыйнага, бо саграванне патрабуе энергіі. На шчасце, восень якраз дае шмат магчымасцяў застацца (ну, ці амаль застацца) у межах «летняй» каларыйнасці рацыёну і пры гэтым адчуваць сябе сытым і поўным сіл. У пошуках прадуктаў для здаровага восеньскага рацыёну адпраўляемся на рынак.

СТАР. 12

«У НАС ЁСЦЬ УСЁ, КАБ МАКСІМАЛЬНА ЗНІЗІЦЬ НАШУ ЗАЛЕЖНАСЦЬ АД АГУЛЬНАСУСВЕТНЫХ УЗРУШЭННЯЎ І НЕДРУЖАЛЮБНЫХ КРОКАЎ АГРЭСІЎНА НАСТРОЕНЫХ ДЗЯРЖАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кажучы аб эканамічнай сітуацыі, Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што яна складаная. «Непрадуманыя дзеянні асобных урадаў, перш за ўсё Захаду, нанеслі адчувальны ўрон сусветнай эканоміцы, — заўважыў ён. — На прыкладзе Беларусі і Расіі вы ўбачылі, як ураз могуць закрыцца традыцыйныя рынкі збыту для нацыянальных тавараў і закупак крытычнага імпарту, стаць недаступнымі пастаянныя ўжо формы міждзяржаўных разлікаў, крыніцы інвестыцый і многае іншае. Але ў нас ёсць усё, каб максімальна знізіць залежнасць ад агульнасусветных узрушэнняў і недружалюбных крокаў агрэсіўна настроеных дзяржаў. Трэба толькі гэтымі магчымасцямі ўмела скарыстацца».

Саміт СНД у Астане прадоўжыўся пасяджэннем Савета кіраўнікоў дзяржаў у шырокім складзе. У адпаведнасці з ратацыяй у 2023 годзе старшынство ў СНД пераходзіць да Кыргызстана. Кіраўнікі дзяржаў прынялі рашэнне, што чарговае пасяджэнне савета кіраўнікоў дзяржаў СНД плануецца правесці 13 кастрычніка 2023 года ў Бішкеку.

Акрамя таго, на палях саміту ў Астане Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні прадстаўнікоў СМІ.

«Усё ў адпаведнасці з планам»

Адзін з расійскіх журналістаў пацікавіўся ў беларускага лідара, у сувязі з чым у Беларусі ўведзены контртэрарыстычны рэжым. «У сувязі з абвастрэннем сітуацыі па перыметры граніц, — паведаміў кіраўнік дзяржавы. — Згодна з дакументамі, якія ў нас на гэты выпадак прадугледжаны ў саюзе Беларусі і Расіі. Гэта даўно прапісана: у сувязі з абвастрэннем уведзены рэжым такой павышанай тэрарыстычнай небяспекі. Таму мы пачалі працэдуры з разгортваннем саюзнай групоўкі войскаў, аснову якой складае, як я ўжо сказаў, армія Беларусі, якая ўжо дапаўняецца часцямі Расійскай Федэрацыі. Усё ў адпаведнасці з планам».

На пытанне журналістаў, як Прэзідэнт Беларусі ўспрымае заяву, што прагучала ва Украіне на афіцыйным узроўні, аб тым, што гэта краіна дэ-факта з'яўляецца членам НАТА, Аляксандр Лукашэнка адказаў, што ніяк. «Жаданае за сапраўднае можна выдаваць, — лічыць беларускі лідар. — А нагогул нас гэта не вельмі хвалюе. Хочуць яны быць членамі НАТА — ну, Гасподзь з імі. З усімі, вядома, наступствамі, якія з гэтага вынікаюць».

Таксама Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю амерыканскай тэлекампаніі NBC.

«Нельга пераходзіць «чырвоныя лініі»

Кіраўніку дзяржавы было зададзена пытанне, наколькі вялікая верагоднасць таго, што Прэзідэнт Расіі вырашыць выкарыстоўваць ядзерную зброю. «Самае галоўнае — свайго суразмоўцу і нават саперніка не заганяйце ў кут, — парэкамендаваў Прэзідэнт Беларусі. — Таму не трэба пераходзіць тыя лініі, як расіяне кажуць, «чырвоныя лініі». Нельга іх пераходзіць. Што да ядзернай зброі, любая зброя для чагосьці ж ствараецца. Ёсць зброя — зразумела, што яна ствараецца для прымянення. Расія дакладна пазначыла сваю пазіцыю: не дай бог, будзе напад на тэрыторыю Расійскай Федэрацыі, у гэтым выпадку Расія можа пры неабходнасці выкарыстоўваць усе віды зброі».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што ніколі, у тым ліку і Прэзідэнт Пуцін, кіраўніцтва Расіі, не ставіла перад сабой мэту прымяніць ядзерную зброю ва Украіне. «Такой неабходнасці няма», — падкрэсліў ён і нагадаў, як некалькі дзён таму Расія нанесла высокадакладнай зброяй удары па Украіне ў адказ на дзеянні ў дачыненні да Крымскага моста. «Вы заўважылі, што гэта сіла. І вельмі прыстойная. Але гэта яшчэ не ўсё. Расія валодае, гэта я дакладна ведаю, самымі сучаснымі відамі зброі. І не трэба ядзернай зброі. Расія справіцца без ядзернай зброі», — запэўніў кіраўнік беларускай дзяржавы. Аднак, заўважыў ён, устае пытанне — каму выгадна мусіраваць гэтую тэму і навошта гэта трэба. «Загінуць ужо не тысячы, а сотні тысяч людзей (у выпадку выкарыстання ядзернай зброі. — **«Зв».**). З боку Украіны ў тым ліку», — сказаў ён.

Па яго словах, трэба шукаць шляхі мірнага вырашэння гэтага канфлікту. «Гэта выгадна для ўсіх, у тым ліку для ЗША», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. Таксама ён заклікаў ЗША не скакаць пад дудку звар'яцелых палітыкаў у пытанні ядзернай зброі. «Вы ведаеце, галоўны ініцыятар, які робіць стаўку на прымяненне ядзернай зброі... Не здагадваецеся, хто? Я вам скажу. Польшча. Яна правакуе вас — ЗША — на нейкія рухі цела ў плане ядзернай зброі. Не паддавайцеся на гэтую хітрасць. Вы буйная тэхналагічная краіна, не трэба скакаць пад дудку звар'яцелых палітыкаў, — заклікаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Ёсць ядзерная зброя — някай яна знаходзіцца на складах там, дзе яна ёсць. Таму што калі толькі рушыць ядзерную зброю, дапусцім, у Польшчу — ланцужковая рэакцыя. З іншага боку рушаць услед крокі ў адказ. Таму не трэба на гэта ісці. Трэба супакоіцца і сесці за стол перагавораў».

«Трэба шукаць шляхі выхаду з сітуацыі»

Адказаў беларускі лідар і на пытанне адносна таго, як Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін рэагуе на сітуацыю, што складваецца ва Украіне. «Ці не здаецца вам, што ён напружаны, можа, ён нервуецца, адчувае ціск?» — пацікавіўся журналіст, адзначыўшы, што Расія пакуль не атрымлівае ва Украіне перамогу.

«Ён жа Прэзідэнт вялізнай краіны. Заўсёды ты адчуваеш нейкую напругу. Гэта я вам кажу як Прэзідэнт. Што датычыцца ўкраінскага канфлікту, тое, што вы кажаце, ён там не атрымлівае перамогу. Ну ў гэтай вайне і вы не атрымліваеце перамогу. Пяцьдзясят дзяржаў сёння ваююць фактычна супраць Расіі на тэрыторыі Украіны. Там таксама з вашага боку няма перамогі. Таму трэба шукаць шляхі выхаду з сітуацыі. І павінен вам сказаць: у адрозненне ад вас — заходнікаў — Прэзідэнт Пуцін неаднойчы прапаноўваў варыянты. Проста яго, відаць, не хочуць слухаць і чуць у цяперашні момант. А трэба было б. Гэта і наша пазіцыя. І, ведаеце, бесперспектыўнасць развіцця ў цяперашняй сітуацыі (як гэта складваецца сітуацыя ва Украіне) прызнаюць і некаторыя члены НАТА. І не некаторыя, а шмат такіх», — канстатаваў беларускі лідар.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка прывёў прыклад Турцыі. З прэзідэнтам гэтай краіны Рэджэпам Таіпам Эрдаганам кіраўнік дзяржавы сустракаўся напярэдадні на палях саміту ў Астане. «Дамовіліся, што хуткім часам мы на высокім узроўні правядзём перагаворы, у тым ліку будзем закранаць пытанне Украіны, — паведаміў Прэзідэнт. — Такі візіт будзе з майго боку ў Анкару. Я заўважыў, што і прэзідэнт Эрдаган — кіраўнік адной з ключавых краін у НАТА — не ў захапленні ад таго, што адбываецца, і ўвесь час нават не намякае, а ўжо патрабуе, што трэба садзіцца за стол перагавораў і дамаўляцца. Трэба было ЗША падключыцца да гэтага працэсу ў такім рэчышчы, а не накіроўваць ва Украіну ўсё большую і большую колькасць самых сучасных відаў зброі. Тым больш ход сітуацыі на фронце ніякія віды зброі, у тым ліку амерыканскія, не памяняюць».

«Мы проста абараняемся»

Адказваючы на пытанне, ці не баіцца кіраўнік дзяржавы эскалацыі, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Баюся. Я не хацеў бы, каб была гэта эскалацыя і нейкае скочванне. Вось якраз з Прэзідэнтам Пуціным на нагах там стаялі, абмяркоўвалі гэтую праблему. Ніхто гэтага не хоча. Ні я не хачу, ні Расія. Нам чалавечыя жыцці каштоўныя. Але вы ж разумееце, што не ад нас гэта залежыць. Калі Захад і асобныя там краіны, вы ведаеце, хто, хочуць, каб не было эскалацыі, яе і не будзе. Мы ж не настойваем на эскалацыі, мы проста абараняемся».

У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб жаданні польскіх улад размясціць на сваёй тэрыторыі ядзерную зброю, а зараз ужо ў Польшчы на гэтую тэму апублікавалі і сацыялагічнае апытанне. «Аж, кажуць, больш за 50 % за тое, каб была ядзерная зброя ў Польшчы. Каб амерыканцы перавезлі. Я не думаю, што там большасць палякаў прытрымліваюцца гэтага пункту гледжання. Але гэта ўжо кіраўніцтва нагнятае сітуацыю. Нібыта і народ просіць польскі», — адзначыў Прэзідэнт. — Вядома, нас гэта насцярожвае». Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў Беларусі з улікам існуючай абстаноўкі прыняты контртэрарыстычныя меры, і на заходнім напрамку сумесна з Расіяй пачалі разгортваць рэгіянальную групоўку.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

АЙЧЫННАЯ ФАРМАЦЭЎТЫКА ЯК ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

У Нацыянальнай акадэміі навук прайшло выязное пасяджэнне экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі на тэму «Аб актуальных праблемах развіцця фармацэўтычнай галіны Рэспублікі Беларусь».

Як адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** адкрываючы пасяджэнне, фармацэўтычная галіна ў цэлым у свеце развіваецца эфектыўна і паспяхова ўносіць значны ўклад у развіццё кожнай краіны. Паводле ацэнак экспертаў, аб'ём сусветнага фармацэўтычнага рынку перасягнуў ужо $1 трлн са штогадовым прыростам каля 8 працэнтаў. У перспектыве чакаецца, што рост сусветнага фармацэўтычнага рынку да 2030 года адносна 2017-га складзе 60 працэнтаў і больш. Наталля Качанава звярнула ўвагу, што ў нашай краіне на бягучую пяцігодку фармацэўтычная галіна вызначана адным з прарыўных пунктаў росту прамысловасці. Прамысловую вытворчасць лекавых прэпаратаў у Беларусі ажыццяўляюць 40 фармацэўтычных прадпрыемстваў, у галіне занята 11 тысяч чалавек. Штогод растуць аб'ёмы вытворчасці, адкрываюцца вытворчасці новых відаў лекавых прэпаратаў.

Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што на развіццё фармгаліны паўплывала пандэмія 2020 года. А санкцыйны ціск адбіўся на зніжэнні паставак беларускіх лекавых сродкаў на знешнія рынкі, скарачэнні аб'ёмаў экспарту. «Прадпрыемствам прыйшлося пераарыентаваць прадукцыю на ўнутраны рынак, а таксама шукаць новыя рынкі збыту ў іншых краінах. Хоць гэта тэма для нас абсалютна не новая. Прэзідэнт краіны яшчэ раней гаварыў аб неабходнасці развіцця свайго фармацэўтычнага рынку, выпуску новых фармпрэпаратаў і лекавых сродкаў. І тады ўжо была пастаўлена задача, што ў нашай краіне павінна выпускацца больш як 50 працэнтаў лекавых сродкаў айчыннай вытворчасці.

Гэта лекавая бяспека. А з улікам санкцыйнага ціску Прэзідэнт дакладна сказаў: мы павінны зрабіць усё, каб нашы людзі не адчулі на сабе гэтыя санкцыі», — адзначыла спікер. Сёння, па яе словах, трэба ведаць, дзе закупляць сыравіну, якую раней закупляліся на традыцыйных рынках Украіны і заходніх краін. Айчынныя вытворцы сёння гэтым займаюцца.

Беларускія лекі недарагія, але якасныя

Наталля Качанава ў размове з журналістамі адзначыла, што беларускія лекавыя прэпараты недарагія, але якасныя. «Я праехала, пабывала практычна на ўсіх фармпрадпрыемствах. Магу адказна запэўніць, што там цудоўныя ўмовы, якія адпавядаюць усім нормам і патрабаванням, што прад'яўляюцца да такіх прадпрыемстваў. Таму якасць гарантавана», — расказала яна. Па словах спікера, 90 працэнтаў лекавых сродкаў у нашых установах аховы здароўя — айчыннай вытворчасці. Яны эфектыўна выкарыстоўваюцца для лячэння розных захворванняў, у тым ліку анкалагічных, дзе лекі вельмі дарагія. І гэта сведчанне таму, што нашы прэпараты высокага ўзроўню. «Стаўка робіцца на айчыннага вытворцу, таму што гэта іншая цэнавая палітыка. Сёння дзяржава ў гэтыя пытанні ўнікае самым сур'ёзным чынам. Мы бачым, што фармпрамысловасць не дапусціла вялікага росту цэн. Пры інфляцыі ў 13 працэнтаў па гэтай галіне рост цэн склаў 5,1 працэнта. Гэта няшмат», — канстатавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што айчынная навука, вытворцы ў фармгаліне павінны не проста працаваць на перспектыву, але і дзесьці больш аператыўна. «Фармрынак — сур'ёзнае ўліванне ў эканоміку кожнай краіны, і тыя лагістычныя ланцужкі і сувязі, якія былі парушаны з увядзеннем санкцый у адносінах да нашай краіны, і тыя задачы, якія раней ставіў Прэзідэнт, сведчаць аб тым, што ў гэтай сітуацыі трэба працаваць аператыўна», — растлумачыла яна.

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег РУМО ў размове з журналістамі падкрэсліў, што фармацэўтычнае пытанне — гэта пытанне нацыянальнай бяспекі. «Сучасныя лекі — супертэхналогіі, самы высокі ўзровень развіцця і навукі, і медыцыны. Развіваючы ўласную фармпрамысловасць, мы вырашаем галоўную задачу: забяспечваем наша насельніцтва якаснымі медыцынскімі прэпаратамі, з іншага боку, мы ствараем перадумовы для развіцця навукі, прамысловасці. У нас з'яўляецца магчымасць заняць у свеце тыя нішы, якія на сёння вызваліліся», — сказаў Алег Румо. Ён расказаў, што ў свеце існуе некалькі кампаній, якія з'ўляюцца сусветнымі лідарамі ў вытворчасці лекаў для транспланталогіі. Гэтыя тэхналогіі даступныя і ў Беларусі. «Беларускія джэнерыкі дастаткова якасныя. Выкарыстоўваюцца абсалютна ва ўсіх галінах нашай спецыяльнасці. А спецыяльнасць высокатэхналагічная, вельмі складаная, такая, якая не даруе дробязяў. Фармальна можна мець адзін і той жа прэпарат, але калі гэты прэпарат будзе няякасны, то вынік — ніякі. І праца каласальнай колькасці людзей, якія ўклалі ў выратаванне жыцця пацыента ўвесь свой інтэлект, знікне. А самае галоўнае — жыццё гэтага чалавека будзе пад пагрозай. Аднак у нас ёсць і вытворчыя магутнасці для выпуску такіх прэпаратаў, ёсць неабходныя субстанцыі для таго, каб рабіць гэтыя прэпараты якасна і забяспечваць нашых грамадзян. А сёння аперацыі па трансплантацыі органаў праведзены больш як шэсць тысяч беларусаў», — адзначыў Алег Румо.

Валерыя СЦЯЦКО.

«З АДНЫМ ДЗІЦЕМ ЦЯЖКА, А З ПЯЦЦЮ — НАШМАТ ЛЯГЧЭЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Удзельнікамі фіналу сталі сям'я Ільюшыных з Брэсцкай вобласці, якая выхоўвае пяць дзяцей, сям'я Трыкоза з Мінска з трыма дзеткамі, сям'я Гаўрыльчанка з Гомельскай вобласці, дзе таксама трое дзетак, сям'я Лаверавых з Віцебшчыны, дзе выхоўваюцца дзесяць дзяцей, сям'я Міклаш з Гродзенскай вобласці з трыма дзеткамі, сям'я Станкевіч з Міншчыны, у якой таксама выхоўваюць трое дзетак, і сям'я Жураўлёвых з Магілёўскай вобласці з чатырма дзеткамі.

У кожнай — свой рэцэпт шчасця, пра які яны і расказалі са сцэны падчас конкурснага этапу «Мая сям'я — мая краіна». Ён складаўся з дзвюх частак — радаводу, своеасаблівай візіткі і прадстаўлення сацыяльна значнага праекта, што расказае пра ўдзел кожнай сям'і ў развіцці свайго раёна.

Сям'я Ільюшыных жыве ў пасёлку Яечкавічы Іванаўскага раёна. Яе галава Алег змяніў кіраўнічую пасаду на служэнне царкве, сёння ён настаяцель храма ў Яечкавічах, стварыў нядзельную школу для дзяцей. А таксама сям'я займаецца ваенна-патрыятычным выхаваннем мясцовых падлеткаў.

Уладзіслаў і Юлія Трыкоза — юрысты, галава сям'і выкладае юрыдычныя дысцыпліны, Юлія працуе старшым пракурорам. Уся сям'я разам з трыма дзецьмі займаецца спортам, яны прэзентавалі праект для Мінска — «Здароўе дзяцей — клопат пра нацыю».

Яўген і Наталля Гаўрыльчанкі з Добруша працуюць інжынерамі на фабрыцы «Герой працы». Сям'я вучыць дзетак памятаць сваіх продкаў, а наведванне і добраўпарадкаванне месцаў баявой славы — іх добрая традыцыя.

Віцебскую вобласць прадставіла сям'я Лаверавых з Дуброўна. Яны выхоўваюць сем сыноў і тры дачкі. Галава сям'і Міхаіл піша вершы і песні, выдаў зборнік паэзіі. Яго жонка Алеся цікавіцца літаратурай, кулінарыяй і дызайнам. А разам сям'я правядзіць шахматныя турніры, малюе, катаецца на веласіпедах і роліках.

Юрый Міклаш з Навaельні Гродзенскай вобласці працуе егерам, яго жонка Алена — педагог Дзятлаўскай школы мастацтваў. А яшчэ яны вясковыя прадпрымальнікі, папулярызуюць гандаль у невялікіх населеных пунктах. А таксама маюць невялікую сельскую ферму, дзе гадуюць чатырох кароў, бычка і вырабляюць сыры.

Сям'я Станкевічаў з Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці жыве ў вёсцы і прадставіла праект «Вёска маладая». Аляксандр Станкевіч працуе галоўным рэжысёрам Дзяржынскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці, Інга Станкевіч — галоўны эканаміст сельгаспрадпрыемства «Логавішча-Агра».

Магілёўскую вобласць прадставіла сям'я Жураўлёвых са Слаўгарада. Марына Жураўлёва — кіраўнік вакальнага ансамбля, Аляксандр Жураўлёў, — гукарэжысёр раённага Дома культуры. Яны любяць падарожнічаць па роднай Беларусі, аб'ехалі шмат гарадоў і вёсак.

— Кожная сям'я — фіналіст рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года» — прыгожая, з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Гледзячы на іх, разумееш, што менавіта гэтая актыўная жыццёвая пазіцыя падштурхнула іх да ўдзелу ў конкурсе, — адзначыла **міністр працы і сацыяльнай абароны старшыня журы конкурсу Ірына КАСЦЕВІЧ.**

Яна выказала ўпэўненасць, што пазытыўны вопыт гэтых прыгожых сем'яў варта максімальна прапагандаваць у краіне. Таму ў залу запрасілі не толькі балельшчыкаў ад кожнага рэгіёна, але і студэнтаў сталічных ВНУ, якія змаглі ацаніць, наколькі важна мець моцную сям'ю, у якой ёсць любоў.

Журы, куды ўвайшлі старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры і маладзёжнай палітыцы Людміла Макарына-Кібак, старшыня Беларускага саюза жанчын Вольга Шпілеўская, памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Леанід Касінскі, спевакі Аляксандра Гайдук і Аляксандр Саладуха, аціаніла сем'і па розных крытэрыях.

Дыплом трэцяй ступені і сертыфікат на 640 рублёў атрымалі сям'я Станкевіч з Мінскай вобласці, сям'я Гаўрыльчык з Гомельскай вобласці, сям'я Трыкоза з Мінска, сям'я Лаверавых з Віцебскай вобласці. Сертыфікаты на 1200 рублёў і дыплом другой ступені — у сем'яў Міклаш з Гродзеншчыны і Жураўлёвых з Магілёўшчыны.

Як адзначыла Вольга Шпілеўская, прадстаўніцы сем'яў — прыклад таго, якімі мусяць быць жонкі і маці, як трэба будаваць кар'еру і сям'ю. А без такіх мужчын не адбылося б і сем'яў.

Пераможцамі конкурсу, уладальнікамі дыплома першай ступені і сертыфіката на 2400 стала сям'я Ільюшыных з Брэсцкай вобласці.

Міністр працы і сацыяльнай абароны, старшыня журы Ірына Касцевіч адзначыла, што ў 2019 годзе нарадзілася ідэя сабраць усіх пераможцаў пяці конкурсаў «Сям'я года» на рэгіянальныя форумы ў маі, напярэдадні Дня сям'і.

— Я сказала, што паеду ў маі 2023 года ў той рэгіён, адкуль будуць сёлетнія пераможцы. Такім чынам, у маі я еду ў Брэст, — сказала міністр, павіншаваўшы ўсіх фіналістаў.

— У нас шмат праектаў — і царкоўных, і дзяржаўных, не было вялікіх трывог на той конт, каб усё паспець, мы так жывём. Канешне, аддалі шмат і духоўных сіл, і фізічных, каб падрыхтавацца. Галоўнае было — не пасварыцца, — падзяліўся першымі ўражаннямі пасля перамогі Алег Ільюшын. — Шмат было репетыцый, гэта займала час, штосьці ў апошні момант рабілі на каленцы, але ў нас усё атрымалася.

— Вельмі рады, што першае месца, — дадала Руслана Ільюшына. — Я хачу сказаць матулям, што не трэба баяцца, што ў сям'і шмат дзяцей. З адным дзіцем цяжка, а з пяццю — нашмат лягчэй. Гэта мае галоўныя памочнікі, і я не ўяўляю сваё жыццё без іх.

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Вялікабрытаніі з-за няправільнага размеркавання сродкаў было страчана звыш сямі мільярдаў долараў

У перыяд пандэміі каранавіруса з пакета сацыяльнай дапамогі, выдзеленай брытанскім урадам, было страчана звыш сямі мільярдаў долараў, вынікае са справаздачы Дзяржаўнага аўдытарскага ўпраўлення Злучанага Каралеўства. Аб гэтым паведаміла ТАСС. Дакумент аўдытарскага ўпраўлення крытыкуе прадстаўнікоў урадавых структур Вялікабрытаніі за «адсутнасць кантролю», што прывяло да атрымання грашовых сродкаў выпадковымі людзьмі і ашуканцамі. Гэтыя асобы атрымалі грошы ў рамках «схемы падтрымкі даходаў самазанятых», не маючы на гэта ніякіх рэальных правоў. Па факце махлярства ў дачыненні да праграмы падтрымкі самазанятых заведзена 24 крымінальныя справы. Па ацэнках экспертаў, ураду Вялікабрытаніі наўрад ці калі-небудзь удасца вярнуць страчаныя грошы ў поўным аб'ёме.

У Парыжы ўведзены ліміт на набыццё бензіну на АЗС

Францыя сутыкнулася з востры дэфіцытам аўтамабільнага паліва. На заправачных станцыях у Парыжы ўжо ўведзены ліміт на набыццё бензіну, паведаміла РІА «Навіны». У цэнтры французскай сталіцы ўтварыліся доўгія чэргі да заправачных станцый, якія стварылі дадатковыя заторы на дарогах. Да рэгулявання сітуацыі былі прыцягнуты паліцэйскія патрулі. Па словах відавочцаў, аўтамабільнае паліва на заправаўках хутка заканчваецца. Некаторыя АЗС былі вымушаны закрыцца. У сувязі з гэтым у Парыжы ўведзены ліміт на набыццё паліва ў 50 еўра. Між тым кошт бензіну ў сталіцы Францыі ўжо перавысіў два еўра за літр, дызельнае паліва прадаецца за два з паловай еўра. Недахоп паліва ў Францыі ўзнік на фоне забастоўкі супрацоўнікаў нафтагазавай кампаніі TotalEnergies, якая пачалася 27 верасня. Пратэстоўцы патрабуюць павышэння зарплат ва ўмовах імклівай інфляцыі ў краіне. Раней паведамлялася, што дэфіцыт паліва стварыў цяжкасці з транспарціроўкай прадуктаў у крамы і ўстановы грамадскага харчавання. Такая сітуацыя можа выліцца ў недахоп харчавання.

Колькасць дзікіх жывёл у свеце за апошнія паўстагоддзя скарацілася амаль на 70 працэнтаў

Такая сумная тэндэнцыя адзначаецца ў дакладзе Сусветнага фонду дзікай прыроды (WWF) «Жывая планета — 2022», паведаміла The Guardian. Указваецца, што прычынай скарачэння колькасці дзікіх жывёл стала дзейнасць чалавека. У прыватнасці, змяншэнне папуляцыі было выклікана забруджваннем навакольнага асяроддзя, высечкай лясоў, а таксама нерацыянальным выкарыстаннем прыродных рэсурсаў. Навукоўцы даследавалі стан 32 тысяч папуляцый 5230 розных відаў. Вынікі аналізу паказалі, што мацней за ўсё фаўна скарацілася ў Лацінскай Амерыцы і Карыбскім басейне — на 94 працэнты. Скарачэнне колькасці дзікіх жывёл у Афрыцы склала 66 працэнтаў, у Азіі і Ціхаакіянскім рэгіёне — 55 працэнтаў. У Паўночнай Амерыцы, Еўропе і Цэнтральнай Азіі фаўна скарацілася на 20 працэнтаў. Адзначаецца, што такое зніжэнне колькасці для чалавецтва было б эквівалентнае страце ўсяго насельніцтва Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, Афрыкі, Акіяніі і Кітая.

ООО «Деловая оценка»

(организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 25 октября 2022 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

ЛОТ № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-270126 площадью 190,9 кв. м, назначение – помещение общественного питания, наименование – помещение общественного питания. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, 2-34. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001000680, площадь 0,1128 га (доля в праве 24/313); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирного жилого дома и изолированного помещения, не относящегося к жилищному фонду.

Начальная цена продажи с учетом НДС: 988 680,00 бел. руб. **Задаток (10 %) с учетом НДС: 98 868,00** бел. руб.

Дополнительные условия: заключен договор аренды с ООО «Пицца Стар» до 26.01.2028 г. Изолированное помещение находится в здании, являющемся недвижимой историко-культурной ценностью.

Продавец: ОАО «Табаквинторг», г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Контактный телефон +375-44-599-02-90.

Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 в ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений заканчивается 24.10.2022 г. в 16.00. Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; стоимость должна быть выплачена в течение **15 (пятнадцати)** календарных дней со дня заключения договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!

Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

1. Здание цеха производства клеевой ленты и объекты благоустройства в г. Волковыск, ул. Новопроектная, 1В.

Начальная цена предмета аукциона – 15 420 руб.

Размер задатка – 2 000 руб.

2. Здание котельной с составными частями и принадлежностями, Волковысский район, Росский с/с, г. п. Россь, ул. Карла Маркса, 8.

Начальная цена предмета аукциона – 15 856 руб. (недвиж. 15 126 руб. + кабель 730 руб.)

Размер задатка – 2 000 руб.

Аукцион состоится – **16.11.2022 г. в 12.00.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул.17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **10.11.2022 г. до 16.00**.

Подробная информация по телефонам:

в городе Волковыске: 8 (01512) 5 13 44, 2 06 03;

в городе Гродно: 8 (0152) 62 39 24, 62 39 34, 62 39 31.

Дополнительная информация размещена на сайте: https://au.nca.by

УНП 500042135

г. МИНСК ИЗВЕЩЕНИЕ 15.11.2022

Сервисно-торговое республиканское унитарное предприятие

«ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

Управления делами Президента Республики Беларусь проводит аукцион на право размещения средств рекламы на следующем объекте недвижимости:

№ лота	Предмет аукциона	Адрес здания	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)
1	Право размещения средств рекламы	г. Минск, Игуменский тракт,16	57,29 руб.	57,29 руб.

Организатор аукциона (продавец и арендодатель) – сервисно-торговое республиканское унитарное предприятие» ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ» Управления делами Президента Республики Беларусь.

Аукцион состоится 10.11.2022 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал. Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27 в рабочие дни: с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 9.00 до 13.00, с 14.00 до 16.15. **Окончание приема заявлений – 10.11.2022 в 15.00.**

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток на расчетный счет BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права размещения средств внутренней рекламы, проводимом 15 ноября 2022 года.

Контакты организатора аукциона: +375 29 188 80 70; + 375 17 266 63 02.

Победителем признается лицо, согласившееся с максимальной ценой продажи лота. Оплата стоимости права аренды производится в течение 3 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона на р/с арендодателя. Договор на размещение средств рекламы подписывается сторонами в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и утверждения протокола о результатах аукциона.

В случае если победитель аукциона не подписал протокол о результатах аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор на размещение средств рекламы, результаты аукциона аннулируются, победителем аукциона уплачивается штраф Организатору аукциона в размере, равном 10 (десяти) процентам от цены продажи предмета аукциона.

алімпіец

ЗВЯЗДА

Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

Уладзімір КАНАПЛЁЎ:

«У ГАНДБОЛЕ МЯНЕ НІХТО НЕ МОЖА ПАДМАНУЦЬ»

Два перамог балельшчыкі і спартсмены прывыкаюць хутка. Як было б выдатна, калі б гучныя перамогі беларускага гандбола 1980-х гадоў не заканчваліся. Але, на жаль, у сярэдзіне 1990-х у Беларусі — час спаду ручнога мяча. Краіны, якая выгадавала восем алімпійскіх чэмпіёнаў, не аказалася ў гандбольным турніры Алімпійскіх гульняў 1996 года. У беларускай зборнай не атрымалася ў 1/8 фіналу чэмпіянату свету 1995 года абыграць немцаў, шлях у Атланту ім быў закрыты. Пачаўся канец цудоўнай эпохі. Папулярнасць ручнога мяча ў краіне імкнулася да нуля, дзверы ў дзіцячыя школы адчыняліся рэдка, клубы прайгравалі камандам, над якімі калісьці смяяліся. Гандбол трэба было ратаваць. Гэта ноша лягла на плечы старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Мікалаевіча Канаплёва, які ў 2006 годзе ўзначаліў Беларускую федэрацыю гандбола. У спорце, як і ў заканатворчай дзейнасці, дробязяў не бывае. Таму работа над адраджэннем гандбола пачалася з невялікіх, але важных крокаў — з дзіцячага спорту, запрашэння спецыялістаў, вяртання ў родныя пенаты найлепшых гульцоў. Праз два гады, у 2008 годзе, беларуская зборная прабілася ў фінальную стадыю чэмпіянату Еўропы, а ў 2013-м выйшла ў плэй-оф чэмпіянату свету. Стала зразумела, што айчынны гандбол ідзе правільным курсам.

Сёння мільёны людзей назіраюць за падзеямі ў свеце ручнога мяча, глядзяць матчы, хварэюць за любімыя каманды, сярод якіх, спадзяёмся, і беларускія. Але толькі адзінкі ведаюць, якую працу трэба прарабіць не толькі трэнерам і спартсменам, але і функцыянерам, каб каманда ў сем чалавек правяла два таймы па 30 хвілін. А Уладзімір Мікалаевіч Канаплёў ведае гэта як ніхто іншы.

— Уладзімір Мікалаевіч, вы займаліся гандболам падчас вучобы ў Магілёўскім педагагічным інстытуце, затым адышлі ад яго, але ўжо 16 гадоў кіруеце айчынным гандболам. Цікавы паварот, ці не так?

— Сапраўды, лёс цікава павярнуўся. Хоць, маім першым відам спорту быў валейбол. У маёй роднай вёсцы Сухары была невялікая спартзала, якая ў 1960-я гады лічылася вельмі добрай. Па цяперашніх мерках яна, вядома, ніякая: дзевяць на васямнаццаць метраў, нізкія столі. Але нам гэтага хапала, каб гуляць у валейбол. Паступіўшы ў Магілёўскі педінстытут, я адразу запісаўся ў секцыю валейбола. А праз месяц пасля пачатку заняткаў нашага трэнера забралі ў армію. Мой сваяк пазнаёміў мяне з Ігарам Карпавічам Рабчанкам, найлепшым гандбольным трэнерам нашага педінстытута. Выдатны спецыяліст і фенаменальны чалавек, які ў 85 гадоў 22 разы падцягваецца. Дзякуючы яму гандбол у Магілёўскім педінстытуце быў папулярнай гульнёй і каманды ў нас былі вельмі моцныя. Нездарма ж у той час гандбол лічыўся гульнёй студэнцкай. Як правіла, у фінал чэмпіянату Магілёўскага педінстытута выходзілі каманды геафака і гістфака. За геафак гуляў я, а за гістфак — Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. І мы ўвесь час прайгравалі гістфаку 1-2 мячы. Хлопцы нават жартавалі, што гэта таму, што Ігар Карповіч выкладае на гістфаку. Але калі сур'ёзна, то ўсё было вытлумачальна. З геафака сур'ёзна гандболам займаліся некалькі чалавек, астатнія хлопцы проста гулялі для сябе. А вось інстытуцкая каманда была дастаткова моцнай. Мы рэгулярна прыязджалі на спаборніцтвы ў Мінск, гулялі супраць моцнага «Палітэха». Менавіта тады я ўпершыню ўбачыў Спартака Пятровіча Мірановіча — сімпатычнага невысокага мужчыну, чыйго погляду баяліся ўсе, каго ён трэніраваў.

— У вас не было думкі будаваць спартыўную кар'еру?

— Падчас вучобы ў інстытуце я выканаў нарматыў на другі спартыўны разрад. І на гэтым разам з заканчэннем інстытута скончылася мая спартыўная кар'ера. Для таго каб прафесійна займацца спортам, трэба быць лепшым, выдатным гульцом. Я быў звычайным сярэднячком і нічым сярод іншых не вылучаўся. Яшчэ 15 гадоў пасля заняткаў гандболам сінякі схадзілі, бо ўвесь час ці сам падаў, ці штурхалі. Скажу шчыра, падчас самых адказных матчаў я сядзеў на лаўцы. Пра якую прафесійную кар'еру ў такім выпадку магла ісці гаворка? Але маё захапленне гандболам падарыла мне карысны вопыт. Я ведаю асновы гэтага спорту, я бачыў яго знутры, і я цудоўна разумею сутнасць гульні. Мяне ў гандболе ніхто не можа падмануць. Я прайшоў гандбольную школу не на трыбунах, а на пляцоўцы. Відаць, не проста так у 2006 годзе Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка падказаў спартыўным кіраўнікам прапанаваць Канаплёву ўзначаліць федэрацыю. Прэзідэнт выдатна разбіраецца ў спорце і разумее, што кіраўнік спартыўнай федэрацыі павінен сам прайсці праз свой від спорту. І мяне ён даўно ведае. Геафак і гістфак Магілёўскага педінстытута разам жылі ў інтэрнаце. А студэнты ў інтэрнаце заўсёды жывуць дружна. Калі Аляксандр Рыгоравіч стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета, прызначыў мяне сваім памочнікам. Так што, згаджаючыся на пасаду старшыні Беларускай федэрацыі гандбола, я разумеў, якія патрабаванні перада мной стаяць.

— Вы прыйшлі ў федэрацыю, калі ў гандболе быў абсалютны застой. Як гэта, ісці кіраваць сферай, дзе праблем больш, чым поспехаў?

— Я прыйшоў у федэрацыю гандбола, калі ў касе федэрацыі было пяць тысяч рублёў ці на той час два з паловай долара. Як можна развіваць спорт, маючы два з паловай долара? Але я прыйшоў у федэрацыю і заявіў, што праз год мы станем алімпійскімі чэмпіёнамі. Гэта было ў духу майго характару, але праз некаторы час я разумею, што гэта быў сапраўдны непрафесіяналізм. Мы закаталі рукавы і пачалі працаваць. Нацыянальную зборную ўзначальваў Спартак Пятровіч Мірановіч. Але ён ужо быў у шаноўным узросце, і я разумеў, што трэба дадаткова прыцягваць маладыя кадры. Запрасілі Георгія Свірыдзенку — алімпійскі чэмпіён, адказны, прыстойны чалавек. Але праца ў нас не склалася. І якраз так сышліся зоркі, што Юрый Шаўцоў у Германіі застаўся не пры справе. Запрасіўшы Шаўцова ў зборную, я не памыліўся. Юрый — трэнер сусветнага ўзроўню, што ён неаднаразова даказваў на практыцы. Калі на сцэне ўсіх падзей з'явіўся Юрый Шаўцоў ужо як трэнер, а не як гулец, у беларускага гандбола адкрылася другое дыханне.

— Вам у заслугу ставяць і вяртанне ў беларускую зборную Сяргея Рутэнкі, на той момант самага моцнага і дарагога гандбаліста. Як вам гэта ўдалося?

— Вярнуць Сяргея дадому з Іспаніі было рэальна складана. Патрэбна была згода Іспанскай федэрацыі гандбола і міжнароднай. А ў той час у Еўрапейскай федэрацыі быў падзел на розныя фракцыі. Краіны паміж сабой аб'ядноўваліся. Я, як былы дэпутат, разумеў, што яны, як лебедзь, рак і шчупак, цягнуць коўдру на сябе. І калі я стаў еўрапейскіх калег прасіць падпісаць наш зварот да іспанскай федэрацыі, яны міла мне паківалі і адышлі ў бок. І толькі прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі гандбола Хасан Мустафа дапамог вырашыць усе юрыдычныя нюансы, але і як чалавек, дзякуючы якому ў краіне з'явілася яшчэ адна нядрэнная каманда. І, што асабліва прыемна, ён і сёння хварэе за гандбол. У Андрэя свой бізнес, але шмат асабістых сродкаў ён укладвае ў турнір у Ашмянах, дапамагае дзіцячым школам. Ён сапраўды патрыёт сваёй краіны, свайго віду спорту. Мне гэта імпануе, таму мы хутка знайшлі агульную мову.

— Спартак Мірановіч сцвярджае, што ў беларускіх клубах павінны быць беларускія гульцы. Але сёння клубы могуць дазволіць сабе легіянераў, калі на гэта ёсць сродкі, і перамагаць з іх дапамогай. Уладзімір Мікалаевіч, які падыход вам бліжэйшы?

— Як кіраўнік і проста як чалавек неабыякавы да гандбола, я цалкам падтрымліваю Спартака Пятровіча. Беларусы, балканцы, шведы — усе зроблены з аднаго мяса, з адных костак. Значыць, трэба выбудаваць працу так, каб нашы хлопцы хутчэй за ўсіх бегалі,

каб Сяргей Рутэнка мог спакойна гуляць за нацыянальную зборную. Былі розныя перыпетыі, але мы іх прайшлі. Часам да мэты крывая прыводзіць хутчэй, чым прамая. Спалучэнне трэнера Шаўцова і гульца Рутэнкі, тандэм гэтых прафесіяналаў сваёй справы далі нам магчымасць выбіцца ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы, а затым і свету.

— Дзякуючы вам на пляцоўку вярнуўся і алімпійскі чэмпіён Андрэй Барбашынскі. Чаму гэта было неабходна?

— Акрамя работы з нацыянальнай камандай, на пачатковым этапе стаяла яшчэ адна важная задача — адраджэнне клубаў. Я сам магіляўчанін, хацелася адрадзіць гандбол у родным горадзе. Стварылі клуб «Машэка». Але для таго каб каманда зайграла, патрэбен быў чалавек, за якім хлопцы б пайшлі. Такім чалавекам стаў Андрэй Барбашынскі. Андрэй — чалавек просты з прынцыпам «трэба — значыць трэба». Яму на той момант было 36 гадоў, ён ужо скончыў гуляць, але для агульнай справы пагадзіўся вярнуцца на пляцоўку. Андрэй скуднеў на 18 кілаграмаў, трэніраваўся нароўні з маладымі хлопцамі, разам з імі спаў у спартыўнай зале, таму што ўмоў ніякіх не было. І ён стаў тым самым стрыжнем каманды, якая пасля нядрэнна гуляла ва ўнутраным чэмпіянаце. Андрэй адыграў вялікую ролю ў нашым гандболе не толькі як алімпійскі чэмпіён, вышэй за ўсіх скакалі, каб у іх былі самыя лепшыя камбінацыі. І тады нашым клубам не патрэбны будуць замежныя гульцы. У савецкі час чэмпіянат СССР было больш складана выйграць, чым чэмпіянат Еўропы ці свету. І пры гэтым усе гулялі сваімі хлопцамі, ніхто не думаў аб замежніках. Цяпер усё змянілася і многія сталі думаць, што замежныя гульцы абавязкова выведуць каманду наперад. У адзін такі момант я ўбачыў, што ў некаторых камандах ёсць засілле легіянераў, а раўнацэнных нашых гульцоў некаторыя трэнеры спецыяльна не выпускаюць на пляцоўку. Тады мы пайшлі па еўрапейскіх стандартах. Па законах еўрапейскай федэрацыі, на гульнях унутранага чэмпіянату нельга выпускаць на пляцоўку больш чым двух замежных гульцоў. Я пашырыў да трох. І сталі гуляць нашы хлопцы. Я нічога дрэннага ў легіянерах не бачу, некаторым беларускім хлопцам трэба імкнуцца да ўзроўню замежных гульцоў. Але лічу, што асновай беларускіх камандаў павінны быць беларускія гандбалісты. Гэта робіць гульню клубаў цікавейшай для сваіх жа гледачоў, умацоўвае зборную. Для таго каб развіваць нацыянальны від спорту, трэба гадаваць сваіх гульцоў. Гэта аксіёма.

— Але для гэтага патрэбныя школы і трэнеры па ўсёй краіне...

— У краіне гандболам займаецца каля сямі тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак. У Мінску працуе школа Спартака Мірановіча, Гарадскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі. У Гомелі і Бабруйску добрыя школы. Нашы лідары Арцём Каралёк, Кірыл Самойла — з Гродна. Калі я пачаў працаваць, мы сутыкнуліся са зменай пакаленняў сярод трэнераў. Старэйшае пакаленне адыходзіла, а маладыя спецыялісты яшчэ не былі гатовы. Мы правялі вялікую працу, арганізавалі шмат семінараў, запрашалі замежных спецыялістаў. Міністэрства спорту, Нацыянальны алімпійскі камітэт, Прэзідэнцкі спартыўны клуб нам тады моцна дапамагалі. Сумеснымі намаганнямі мы падрыхтавалі маладых хлопцаў, якія зараз нядрэнна трэніруюць спартсменаў. Андрэй Мачалаў быў найлепшым гульцом у БГК, зараз кіруе гомельскім клубам. Дзмітрый Ціхан набраўся вопыту ў Польшчы, зараз яго ў БГК перадае моладзі. У Андрэя Крайнава ў СКА ўвогуле ўсё выдатна, ён добры гаспадар у сваім клубе. З ім працуюць Ігар Папруга, Сяргей Шыловіч, Дзіма Нікуленкаў, Ваня Броўка — усе нашы хлопцы. З былых нядрэнных ігракоў мы падрыхтавалі маладое пакаленне класных трэнераў.

— Уладзімір Мікалаевіч, а што рабіць з жаночым гандболам? Тут, на жаль, не ўсё так добра, як у мужчын.

— Вельмі хвалюе ўзровень жаночага гандбола. Гэта перш за ўсё мая віна і трэнераў ад дзіцячых каманд да зборнай. Асноўная праблема жаночага гандбола — спецыялісты і падбор спартсменаў. Пакуль не склалася. Для таго каб каманда проста прабілася ў фінальную стадыю чэмпіянату міру і Еўропы, уся федэрацыя павінна прыкласці максімум намаганняў. Гэта вялізная праца, якая патрабуе часу. Дзяўчаты ў нас малайцы: імкнуцца як могуць. Але то з Румыніяй сустрэнуцца, як у 2015 годзе на адборы да чэмпіянату Еўропы, то з Нарвегіяй, як у 2019 годзе на кваліфікацыі да чэмпіянату свету. А гэта ж наймацнейшыя каманды свету. І дзяўчаты біліся, гулялі. Здаецца, толькі святло ў канцы тунэля з'явілася — у кваліфікацыі да чэмпіянату Еўропы 2022 унічыю згулялі з Германіяй. У нас заставаліся хатнія гульні. Нам трэба было абыграць Германію дома ці хоць бы згуляць унічыю з лепшым лікам, і выйшлі б у фінальную частку. Але ў лютым пачаліся ваенныя падзеі ва Украіне, і ўсё, нас адхілілі.

— Дарэчы, як беларускі гандбол перажывае гэты непрыемны перыяд адхілення ад міжнародных стартаў?

— Мы, вядома, рукі не апусцілі, хутка сарыентаваліся. Спартсмены не губляюць гульнявую практыку дзякуючы расійскім калегам. Але расіянам нецікава гуляць з намі ў жаночы гандбол. Нашы найлепшыя каманды «Гомель», БНТУ-БелАЗ могуць гуляць толькі супраць пятых-шостых каманд Расіі. Але хоць у хлопцаў усё добра, у сезоне 2022/2023 у SEHA-лізе выступаюць СКА-Мінск, БГК Мяшкоў, «Машэка» і «Гомель». Мы падпісалі дагавор аб супрацоўніцтве з Кітайскай гандбольнай федэрацыяй. Каманды нашых краін праводзяць

сумесныя матчы, зборы. Мы арганізавалі сумесную лігу з Расіяй. Дзякуй майму расійскаму калегу Сяргею Шышкарову за тое, што падтрымаў гэтую ідэю і дапамог у яе ўвасабленні.

— Зразумела, што калісьці розум возьме верх і нашы спартсмены вернуцца на міжнародныя турніры. Як вы думаеце, мара аб выступленні беларускай каманды на Алімпійскіх гульнях спраўдзіцца?

— Усе гэтыя гады мы разам ішлі да гэтай мары. Але рэалізаваць яе вельмі складана. Гандбол у свеце развіваюць больш за 190 краін. Наймацнейшыя каманды сканцэнтраваны ў Еўропе. А на Алімпійскія гульні трапляе толькі 12 каманд. Самае галоўнае, што мы за ўсе гэтыя гады сталі рыхтаваць моладзь, была праведзена вялікая работа. Прэзідэнт міжнароднай федэрацыі Хасан Мустафа ў мяне неяк спытаўся, чаму я так імкнуся на Алімпійскія гульні, калі наша каманда і так сярод найлепшых. Я яму патлумачыў, што кіраўнік дзяржавы ставіць перад намі задачу — быць мінімум бронзавымі прызёрамі. Мустафа задумаўся. Мы падвялі сваіх хлопцаў да таго, каб яны маглі змагацца за пуцёўку на Алімпіяду. І яны маглі яе ўзяць. У нас добры склад гульцоў, у нас моцны трэнерскі штаб. Некаторыя могуць сцвярджаць, што Шаўцоў як трэнер састарэў. Але Шаўцоў прафесіянал, які ўвесь час развіваецца, і ў яго ёсць маладыя калегі. Уладзіслаў Кулеш, Арцём Каралёк, Мікіта Вайлупаў, Вадзім Гайдучэнка, Андрэй Юрынак, Вячаслаў Бохан — у нас шмат класных перспектыўных гандбалістаў. І гэтае адхіленне збылтала нам усе планы. Самае крыўднае, што Еўрапейская і міжнародная федэрацыі маглі за нас пазмагацца. Але яны ўсе схілілі галовы перад Міжнародным алімпійскім камітэтам. У кулуарах нам спачуваюць, але палітыка, на жаль, перамагае. Але, нягледзячы ні на што, мы не губляем надзеі і гадуем маладое пакаленне, каб вярнуцца на міжнародную арэну яшчэ мацнейшымі.

— Уладзімір Мікалаевіч, сярод кіраўнікоў беларускіх спартыўных федэрацый вы доўгажыхар. Ці можна стаміцца ад любімага спорту?

— У спорце я жыву актыўным, насычаным жыццём, шмат маю стасункаў з моладдзю. Спорт — такая жывая артэрыя, дзе ўвесь час кіпіць падзеі і ўсё мяняецца. Вырашаеш адны задачы — з'яўляюцца іншыя, сумаваць няма калі. І мне гэта не надакучыла, мне падабаецца такі жыццёвы тэмп. І я прыношу карысць любімаму гандболу. Я сваю каманду папярэдзіў, каб яны мне сказалі, калі я стану бескарысным. І сам сабе я сказаў: як толькі ўбачу, што да маіх парад не прыслухоўваюцца, мяне не чуюць і я нічым не магу дапамагчы гандболу, — я з лёгкай душой і чыстым сумленнем саступлю сваё месца моладзі.

— А чым вы больш за ўсё ганарыцеся за гэтыя 16 гадоў?

— За час сваёй працы на пасадзе старшыні федэрацыі я больш за ўсё ганаруся тым, што я і мае аднадумцы стварылі надзейны калектыў ад каманды федэрацыі да ўсёй гандбольнай супольнасці ў Беларусі. У нас адкрытасць меркавання, узаемадапамога і ўзаемападтрымка. Мы разам радуемся перамогам і перажываем няўдачы. Мы стварылі добры рэзерв на будучыню. Так, здараюцца асечкі. Напрыклад, на чэмпіянаце свету ў Егіпце мы згулялі неналежным чынам. Але гэта жыццё. Самае галоўнае — што мы маем імкненне і жаданне ісці наперад.

Спорт без беларускіх і расійскіх спартсменаў — гэта фізкультура

У юбілей БДУФК амберкавалі актуальныя спартыўныя пытанні

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры адзначае юбілей. Адзінай профільнай установе вышэйшай адукацыі ў краіне, якая рыхтуе спецыялістаў у галіне фізічнай культуры, спорту і турызму, спаўняецца 85 гадоў. Інстытут фізічнай культуры БССР заснаваны ў 1937 годзе пасля рэарганізацыі Беларускага тэхнікума фізкультуры. У 1993 годзе ўстанова адукацыі была пераўтворана ў Акадэмію фізічнага выхавання і спорту Рэспублікі Беларусь, а сучасную назву ўніверсітэт атрымаў у 2003 годзе.

Фота БелТА.

З 85-гадовым юбілеем БДУФК павіншаваў Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар Лукашэнка. Кіраўнік НАК Беларусі адзначыў, што з моманту ўтварэння галоўнай мэтай універсітэта застаецца развіццё спартыўнай галіны і падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў гэтай сферы ў Беларусі. Віктар Лукашэнка таксама падкрэсліў, што БДУФК з невялікага тэхнікума вырас у адну з найбуйнейшых ВНУ ў галіне фізічнай культуры, спорту і турызму ў СНД, а з яго сцен выйшлі многія знакамітыя трэнеры і спартсмены, чэмпіёны і прызёры Алімпійскіх гульняў і сусветных першынстваў. «Прафесарска-выкладчыцкі склад і супрацоўнікі беражліва захоўваюць і працягваюць найлепшыя традыцыі ўніверсітэта. Сучасная трэніровачная база і высокапрафесійныя спецыялісты дазваляюць весці якасную падрыхтоўку і забяспечваюць адукацыйны працэс на высокім узроўні. У кожнага са студэнтаў ёсць магчымасці для самарэалізацыі, атрымання неабходных ведаў, якія яны могуць прымяніць на практыцы», — гаворыцца ў віншаванні.

У рамках святкавання 85-гадовага юбілею БДУФК у Мінску прайшоў II Міжнародны навуковы кангрэс «Каштоўнасці, традыцыі і навацыі сучаснага спорту». Праграма форуму ўключала тэматычныя выставы, адкрытыя дыскусійныя пляцоўкі, майстар-класы, прэзентацыі, круглыя сталы і семінары-практыкумы. Удзел у кангрэсе прынялі **міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Сяргей КАВАЛЬЧУК** і **міністр спорту Расійскай Федэрацыі Алег МАТЫЦЫН.** Сяргей Кавальчук у сваім выступленні падкрэсліў, што палітыка сёння стаіць вышэй за спорт, дзеячы спрабуюць праз спорт ціснуць на людзей і ўкараняць свае так званыя каштоўнасці. Але, па словах міністра, спорт патрэбны для таго, каб аб'ядноўваць людзей. Ён заўважыў, што ў алімпійскай хартыі МАК прапісаны гэтыя прынцыпы. «Але людзі, якія сёння кіруюць вялікім спортам, нешта пераблыталі ў гэтым жыцці. Замест таго каб аб'ядноўваць народы і рабіць спорт пляцоўкай для дружбы, яны ўмешваюць туды палітыку, хоць спорт без спартсменаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі — гэта фізкультура, турніры рэгіянальнага ўзроўню, асабліва спаборніцтвы па веславанні, мастацкай гімнастыцы, скачках на батуце, барацьбе, ды і па многіх іншых відах», — падкрэсліў Сяргей Кавальчук. Міністр спорту адзначыў важнасць беларуска-расійскіх адносін у сферы спорту, сяброўства паміж краінамі. «Раней калегіі Міністэрства спорту Беларусі і Расіі праводзіліся раз на два гады, а сёння — кожныя тры месяцы. І мы бачым станоўчую дынаміку. Для спартсмена галоўнае — спаборніцкая практыка, добрая канкурэнцыя і ўзнагарода, і ўсё гэта створана. У расійскіх калег ёсць добры тэрмін — імпартааператыўнае, і мы сапраўды ідзём у гэтым кірунку. На нашых сумесных спаборніцтвах шматлікія вынікі вышэйшыя, чым на еўрапейскіх першынствах. Мы — самадастатковыя дзяржавы, і трэба зрабіць так, каб мы ні ад каго не залежалі, каб ніхто не дыктаваў умовы. Калі мы выкарыстоўваем цяперашнюю сітуацыю дакладна, то выведзем наш спорт на новы ўзровень», — дадаў Сяргей Кавальчук.

Міністр спорту РФ Алег Матыцын пагадзіўся са сваім беларускім калегам. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі і Расіі вялікі патэнцыял супрацоўніцтва. Па словах Алега Матыцына, работа беларускіх і расійскіх спартыўных федэрацый у адной звязцы з'яўляецца прыкладам для многіх краін. «Мы ганарымся, што ў нас ёсць такі надзейны партнёр, мы рады вашым поспехам і таму факту, што Прэзідэнт краіны ўдзяляе спорту вялікую ўвагу», — сказаў ён. Міністр спорту РФ падкрэсліў, што сусветны спорт шмат што страціў з-за адхілення беларусаў і расіян. «Узровень гасціннасці ў нашых краінах вельмі высокі: дзяржавы, якія здольны гэтак жа кампетэнтна правесці спаборніцтвы, можна пералічыць на пальцах адной рукі. Гэта разумеюць усе, у тым ліку і Міжнародны алімпійскі камітэт. Відавочна, што фінансавы складнік без удзелу нашых спартсменаў зараз ідзе ўніз», — сказаў Алег Матыцын. Ён выказаў спадзяванне, што беларускія і расійскія спартсмены будуць дапушчаны да Алімпійскіх гульняў 2024 года ў Парыжы: «Палітызацыя спорту далей немагчымая, яна спараджае крызіс усяго алімпійскага руху».

ТРЭНІРОЎКІ НА ДРЭВЕ, «МУЗЫЧНЫЯ СТРУНЫ» І СУПЕРПАДРЫХТОЎКА

Як развівалася тэнісная школа МАЗ

Вялікія перамогі пачынаюцца ў дзіцячых школах, бо трэба ж недзе прывыкаць да сур'ёзных нагрузак і вучыцца дабівацца выніку. Адной з такіх школ у гісторыі беларускага тэніса стала школа пры Мінскім аўтамабільным заводзе, якая была вядома на ўвесь Савецкі Саюз як школа МАЗ. На яе кортах раслі чэмпіёны Еўропы Наталля Барадзіна і Сяргей Леанюк, яна адкрыла дарогу ў тэніс Сяргею Цяцерыну, Аляксандру Дземідзенку, Таццяне Пучак, Уладзіміру Валчкову і многім іншым славутым беларускім тэнісістам. Бацька-заснавальнік школы МАЗ — легендарны трэнер Аркадзь Львовіч Эйдэльман. А разам з ім першыя крокі пакуль яшчэ не школы, а секцыі рабіў Эдуард Дуброў, асоба ў беларускім тэнісе вядомая.

У 1960-я тэніс, як і ўсе іншыя віды спорту, развіваўся дзякуючы спартыўным таварыствам. Тэніс быў прадстаўлены практычна ў кожным з іх, у кожным з іх былі добрыя трэнеры, працавалі спартыўныя школы. У СКА — Марат Мікалаевіч Звераў, у «Дынама» — Генадзь Антонавіч Пятроў. Уладзімір Барысавіч Скугароў працаваў у СДЮШАР, Георгій Уладзіміравіч Краўкоў — у комплексе «Змена». Аркадзь Эйдэльман трэніраваў у «Чырвоным сцягу». Асноўнымі сапернікамі былі «Дынама» і «Чырвоны сцяг». Часцей за ўсё пераможцамі станавіліся чырванасцяжнікі.

Аркадзь Эйдэльман пачаў весці заняткі па тэнісе на МАЗе практычна адразу пасля арміі. Але, па словах Эдуарда Дуброва, 12-гадовыя хлапчукі ўсё роўна называлі 23-гадовага трэнера «дзядзькам». Трэніраваліся будучыя тэнісісты ва ўмовах, якія сучасным гульцам могуць здацца немагчымымі. «У нас быў адзін корт за інтэрнатам аўтазавода. Дарэчы, там жа праходзілі і заняткі па барацьбе, з-за якіх я прагульваў урокі. Усё было ў адным будынку. У падвале — барцоўская зала з дываном, мелася раздзявалкі, чамусьці пакой для лыж. І нам, тэнісістам, выдзелілі адно памяшканне, там была трэнерская. На тэрыторыі былі яшчэ чатыры пляцоўкі для мястэчкаў, баскетбольная, валейбольная і гандбольная пляцоўкі, адзін тэнісны корт», — успамінае Эдуард Дуброў.

Усё змянілася ў 1962 годзе, калі кіраўніцтва Мінскага аўтамабільнага завода дамовілася са сваім пабрацімам, швейцарскім заводам, правесці таварыскі матч. Спецыяльна дзеля гэтай падзеі пабудавалі яшчэ адзін тэнісны корт. І з гэтага часу тэніс на аўтазаводзе пачаў пашырацца: прыбралі баскетбольную і валейбольную пляцоўкі, пакінулі толькі гандбол. Потым і гандбол прыбралі, на заводзе каманды не было.

«З кожным годам у нас раслі вынікі, з'яўляліся майстры спорту, чэмпіёны і прызёры чэмпіянату рэспублікі. З часам наша школа МАЗ стала адной з найлепшых у Савецкім Саюзе. Асноўнымі нашымі сапернікамі ў СССР былі маскоўскі «Спартак», украінскі «Антэй». Гэтыя тры школы былі найлепшымі дзіцяча-юнацкімі спартыўнымі школамі ў Савецкім Саюзе. Работнікі завода таксама прыходзілі да нас гуляць у тэніс. І мы, 12-гадовыя хлапчукі, глядзелі на іх і імкнуліся гуляць гэтак жа, як яны. Я, калі ўжо сам трэніраваў, часта ставіў найбольш здольных дзяцей пагуляць з дарослымі, каб яны паглядзелі, якая можа быць хуткасць, як сябе паводзіць на корце. Гэта такі тонкі псіхалагічны ход Аркадзя Львовіча. Эйдэльман быў трэнерам вельмі патрабавальным, але не злым. Ён шмат у нас укладваў і хацеў бачыць аддачу», — расказвае Эдуард Уладзіміравіч.

У шматлікіх інтэрв'ю сваім улюбёным пакрыццём Эдуард Дуброў называе... дрэва. Паводле яго слоў, за савецкім часам гэта было самае хуткае пакрыццё. Праўда, яно ж было і самым распаўсюджаным. У мінскім будтрэсце № 5, у школе МАЗ, у Доме афіцэраў — усюды было драўлянае пакрыццё. Эдуард Уладзіміравіч зазначае, што яно патрабавала сур'ёзнай фізічнай падрыхтоўкі.

А што па экіпіроўцы і форме? «Мячы былі ленінградскія: белыя з сінім надпісам. Струны ў ракетках былі з жылаў быкоў, таму вельмі адчувальныя да вільгаці. Не дай бог, пагуляеш у дождж, потым толькі чуеш уначы, як яны лопаюцца. Пасля ўжо з'явіліся штучныя струны. Ракеткі — драўляныя. Але яны доўга не выстрымлівалі гульні, я іх увесь час ламаў. Красавак для гульні ў нас таксама не было. Кожны тэнісіст імкнуўся займець спецыяльныя красоўкі за 6 рублёў 40 капеек на поліўрэтанавай падэшве з вострым носам. Усе ўладальнікі такіх красовак вельмі імі ганарыліся, у такім абутку было зручна гуляць. Праблемы пачыналіся пасля таго, як пагуляеш у гэтых красоўках на грунтавым пакрыцці — яны станавіліся брудныя. Дома старанна іх сціралі, зубной пастай чысцілі, каб былі беленькія. Форму куплялі самі. Я — у вядучых гульцоў саюза, у іх была магчымасць прывезці з-за мяжы. А майкі і шорты выдаваў «Чырвоны сцяг», — расказвае Эдуард Дуброў.

Многія знакамітыя тэнісісты, чый шлях у вялікі спорт пачаўся менавіта на мазаўскіх кортах, з цеплынёй успамінаюць сваю дзіцяча-юнацкую школу. Гэта не проста ўстанова — гэта прыклад таго, як адданасць сваёй справе, прафесіяналізм і талент трэнераў і спартсменаў прыводзяць да выніку, аб якім гаварыла ўся краіна. Нездарма ж школа МАЗ лічылася адной з найлепшых дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ у СССР.

Пазней, калі ўжо Эдуард Дуброў трэніраваў на кортах роднай школы, тут выраслі 30 майстроў спорту, з іх сем — міжнароднага класа. Іх імёны лепей вядомыя сучасным аматарам тэніса. Гэта Марына Сцец, Надзея Астроўская, Дар'я Кустава, Уладзімір Ігнаціх, Лідзія Марозава, Іма Богуш.

А пачалася ўся гэтая гісторыя на тэнісным корце за інтэрнатам аўтазавода...

Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «БЕЛИНКАСГРУПП»

www.belincasgroup.by

Форма 1

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС 30 сентября 2022 г.

Открытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	30.09.2022	31.12.2021
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101		4 307	4 562
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		101	22 791
5	Средства в банках	1104		61 906	36 452
6	Ценные бумаги	1105		-	-
7	Кредиты клиентам	1106		-	-
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		74 300	73 039
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		537	543
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		-	30
13	Отложенные налоговые активы	1112		-	-
14	Прочие активы	1113		18 743	15 539
15	ИТОГО активы	11		159 894	152 956
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
17	Средства Национального банка	1201		-	-
18	Средства банков	1202		35	-
19	Средства клиентов	1203		-	5 954
20	Ценные бумаги банка	1204		-	-
21	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
23	Прочие обязательства	1207		8 864	6 855
24	ВСЕГО обязательства	120		8 899	12 809
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ				
26	Уставный фонд	1211		121 002	121 002
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		13 950	7 801
29	Фонды переоценки статей баланса	1214		-	-
30	Накопленная прибыль	1215		16 043	11 344
31	ВСЕГО собственный капитал	121		150 995	140 147
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		159 894	152 956

форма 2

ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 01.10.2022

Открытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 01.10.2022	На 01.10.2021
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		5 868	4 460
2	Процентные расходы	2012		-	-
3	Чистые процентные доходы	201		5 868	4 460
4	Комиссионные доходы	2021		48 500	40 875
5	Комиссионные расходы	2022		89	58
6	Чистые комиссионные доходы	202		48 411	40 817
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		(169)	(48)
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207		1 898	1 208
12	Прочие доходы	208		53 033	47 251
13	Операционные расходы	209		88 578	81 373
14	Прочие расходы	210		3	1
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		16 664	9 898
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		5 816	4 020
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		10 848	5 878
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях			-	-
19	Базовая прибыль на простую акцию	22		-	-
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23		-	-

Заместитель Председателя Правления А. Н. Прищиц

Главный бухгалтер Н. А. Ероховец

Дата подписания: 4 октября 2022 г.

УНП 807000270

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703.
Продавец	ОАО «Криница», г. Минск, ул. Радиальная, 52
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов: транспортные средства с пробегом. Месторасположение: г. Минск, ул. Радиальная, 52

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена с НДС, руб.
1	Легковой внедорожник универсал **Volkswagen Touareg**, рег. знак 9307 РК-7, 2011 г. в.	18 908	53 880
2	Легковой седан **Volvo S80**, рег. знак 9502 МІ-7, 2005 г. в.	18 908	10 440
3	Легковой хэтчбек **Lada Granta 219110**, рег. знак 1065 СК-7, 2018 г. в.	19 696	15 600
4	Легковой хэтчбек **Lada Granta 219110**, рег. знак 1067 СК-7, 2018 г.в.	19 694	15 600
5	Легковой седан **Volvo S80**, рег. знак 9240МЕ-7, 2003 г. в.	16 778	10 200
6	Легковой **седан Volvo S60**, рег. знак 9794 КЕ-7, 2001 г. в.	15 301	11 280
7	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3309**, рег. знак АЕ 8090-7, 2008 г. в.	14 589	5400
8	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3309**, рег. знак АЕ 8093-7, 2008 г. в.	14 588	2760
9	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3302**, рег. знак АА 4942-7, 2006 г. в.	12 304	5520
10	Автобус-вагон **GAZ-32212-764**, рег. знак АР 3636-7, 2017 г. в.	13 413	20 160
11	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3302**, рег. знак АЕ 7528-7, 2008 г. в.	14 566	5520
12	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3302**, рег. знак АЕ 7530-7, 2008 г. в.	14 558	6600
13	Грузовой специальный фургон изотермический **GAZ 3302 BELAVA 1220**, рег. знак АР 2066-7, 2013 г. в.	19 286	5880
14	Грузовой бортовой тентовый **ГАЗ 33021**, рег. знак КМ1257, 1996 г. в.	6765	4800
15	Грузовой специальный седельный тягач **MAZ 5440A8-360-030**, рег. знак АН 4876-7, 2013 г. в.	17 894	10 680
16	Полуприцеп фургон изотермический **«КУПАВА 930011»**, рег. знак А 3540 А -7, 2008 г. в.	14 561	4560
17	Грузовой седельный тягач **МАЗ 54323**, рег. знак АВ 9412-7, 1990 г. в.	2718	4800
17	Полуприцеп бортовой **ОДАЗ 9370**, рег. знак 8410 ЖМ, 1989 г. в.	6098	2400
18	Грузовой бортовой тентовый **ГАЗ 330232**, рег. знак АА 6568-7, 2006 г. в.	12 350	4920
19	Грузовой фургон **«Пежо Партнер»**, рег. знак АА 6588-7, 2006 г. в.	12352	4 800
20	Грузовой фургон **«Пежо Партнер»**, рег. знак АА 7153-7, 2006 г. в.	12370	4 800
21	Грузовой бортовой тентовый **ГАЗ 33023**, рег. знак АЕ 8939-7, 2008 г. в.	14800	6 000
22	Грузовой вагон **GAZ-2752**, рег.знак АА 3792-7, 2006 г.в.	15177	6 360
23	Грузовой фургон **«Пежо Партнер»**, рег. знак АА 6589-7, 2006 г. в.	12352	4 800
24	Грузовой фургон изотермический **GAZ 27751 10**, рег. знак АІ 1529-7, 2005 г. в.	8084	4 680
25	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3302**, рег. знак АЕ 7532-7, 2008 г. в.	14560	4 440
26	Седельный тягач **ЗИЛ 44151**, рег. знак 4242МИТ, 1989 г. в.	2711	5 160
27	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3309**, рег. знак АЕ 8092-7, 2008 г. в.	15 177	6120
28	Полуприцеп цистерна **ОДАЗ 857**, рег. знак 8659ЖМ, 1989 г. в.	2694	6120
29	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3302**, рег. знак АЕ 7527-7, 2008 г. в.	14 555	6600
30	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3302**, рег. знак АЕ 7529-7, 2008 г. в.	14 557	5520
31	Грузовой фургон **ГАЗ 3307**, рег. знак КА8103, 2004 г. в.	10 606	1560
32	Полуприцеп фургон изотермический **«КУПАВА 930011»**, рег. знак А 3519 А-7, 2008 г. в.	14 799	6840
33	Грузовой седельный тягач **МАЗ 5440А8**, рег. знак АЕ 6623-7, 2008 г. в.	14 518	3480
34	Полуприцеп фургон изотермический **«КУПАВА 930011»**, рег. знак А 3645 А-7, 2008 г. в.	14 584	4560
35	Грузовой седельный тягач **MAZ 5440A8-.360-030**, рег. знак АН 4733-7, 2013 г. в.	17 927	10 680
36	Полуприцеп фургон изотермический **«КУПАВА 930011»**, рег. знак А 3518А-7, 2008 г. в.	14 562	4560
37	Грузовой седельный тягач **MAZ 5440A8**, рег. знак АС 5570-7, 2008 г. в.	14 520	5280
38	Полуприцеп специальный фургон-рефрижератор **Schmitz SK024**, рег. знак А 0930 А-7, 2000 г. в.	19 658	10 080
39	Грузовой фургон тентовый **MAZ 533605-221**, рег. знак АТ 5780-7, 2009 г. в.	19 657	10 080
40	Грузовой фургон изотермический **ГАЗ 3302**, рег. знак АЕ 7531-7, 2008 г. в.	14 559	3480
41	Автопогрузчик **ДВ-1661.28**	11 803	1920

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by**. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **9 – 10 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 15.11.2022 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.11.2022 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

---

ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ № 7 В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Строительство многоэтажного жилого комплекса в поселке Прилуки Минского района. Жилой дом № 18 по генплану», опубликованную в газете «Звязда», номер от 26.05.2021 г. № 97 (29466)

Общество с ограниченной ответственностью «МайКлассКом» информирует о внесении дополнений и изменений в вышеуказанную проектную декларацию следующего содержания:

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:
начало строительства – май 2021 года;
окончание строительства – ноябрь 2022 года.

Результаты государственной экспертизы проектной документации: заключение от 10.05.2022 г. № 576-70/22, выданное Дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по Минской области».

Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования настоящих дополнений и изменений в проектную декларацию:

- 1 (одна) однокомнатная квартира общей площадью по проекту 39,87 кв. м. Стоимость за 1 (один) кв. м общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную до 1000 долларов США;
- 6 (шесть) двухкомнатных квартир общей площадью по проекту от 65,06 до 66,75 кв. м. Стоимость за 1 (один) кв. м общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную до 950 долларов США;
- 5 (пять) трехкомнатных квартир общей площадью по проекту от 78,64 до 95,72 кв. м каждая. Стоимость за 1 (один) кв. м общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную до 900 долларов США.

В организации проводятся акции, действует система регулирования цены квадратного метра, зависящая от общей площади, этажа, типа планировки квартиры, а также система скидок, зависящая от размера первоначального взноса, периода рассрочки и графика внесения платежей. Цена объекта долевого строительства (цена договора), установленная в договоре в привязке к иностранной валюте, является неизменной до окончания строительства, за исключением случаев, изменения цены объекта долевого строительства по соглашению сторон.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена сторонами договора.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «МайКлассКом» по адресу: г. Минск, ул. Кульман, д. 11, офис 1, 7-й этаж, отделе продаж по адресу: Минская область, Минский район, Сеницкий сельский совет, аг. Прилуки, ул. Майская, д. 2, пом. 108 и (или) на сайте http://vyselka.by, а также по контактным телефонам специалистов отдела продаж: +375 33 6666 372, +375 29 8888 372.

УНП 191443174

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Агролизинг», 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31, +37517-242-13-81

Предмет аукциона

Лот №	Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инв. номер
1	**Административное помещение** (административное помещение) по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 4-1Н	884 кв. м	500/D-70779533
Начальная цена с НДС 20 % – 991 630,59 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)			
2	**Торговое помещение** (торговое помещение) по адресу: г. Борисов, ул. Строителей, д. 26, пом. 5	1672,1 кв. м	610/D-47661
Начальная цена с НДС 20 % – 875 036,08 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)			

Условия по лоту № 2: в случае признания победителем аукциона либо единственным участником, согласившимся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов, хозяйствующего субъекта, до совершения сделки, может потребоваться согласие антимонопольного органа (Министерства антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь) на экономическую концентрацию

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней после проведения аукциона и, при необходимости, получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена **в течение 30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи и, при необходимости, получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 07.07.2022

Аукцион состоится 15.11.2022 в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.11.2022 до 17.00 по** указанному адресу

Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

ВАРАЖБА НА ДРОВАХ

Чаму Еўропа коціцца ў Сярэднявечча?

Брокерская кампанія Barclays Capital прагназуе, што рост цэн на энерганосьбіты, жорсткія меры еўрапейскага Цэнтрабанка і скарачэнне попыту прывядуць да рэцэсіі ў Еўрасаюзе і падзення валавога ўнутранага прадукту не менш чым на 1,7 працэнта. Пры гэтым больш за ўсё пацерпяць такія краіны, як Германія, Францыя, Італія і Іспанія. «Навіны з Заходняй Еўропы нагадваюць тыя, што некалі прыходзілі з такіх краін, як Балівія», — заўважыў у рэдакцыйным артыкуле аглядальнік Forbes Кенэт Рапоза. Па яго меркаванні, краіны Старога Свету, якія трапілі ў працяглы энергетычны крызіс, цяпер рызыкуюць вярнуцца ў Сярэднявечча. Куды коціцца Еўропа?

НОВАЕ ЗОЛАТА

Еўрапейцы мітусліва рыхтуюцца да надыходзячай зімы. У краінах ЕС назіраецца скачок цэн не толькі на прыродны газ, але і на альтэрнатыўнае паліва — дровы. Людзі скупляюць бярвенне, каб не змерзнуць падчас халадоў, адзначыў Baltnews. Недальнабачныя дзеянні еўрапейскіх палітыкаў паставілі пад удар уласнае насельніцтва. Ужо зараз грамадзяне думаюць, на якія сродкі аплачваць рахункі за электраэнергію і як не змерзнуць гэтай зімой.

І найбольш у гэтым плане пацярпела менавіта Германія. Па словах жыхара Мюнхена Ёрга Мертэнса, сума яго жнівеньскага рахунку за электраэнергію ўзрасла на 70 працэнтаў. Ён адзначыў, што, жывучы на адну пенсію, пасля аплаты рахункаў за святло і ацяпленне ў яго застанецца прыкладна 365 еўра на харчаванне, лекі ды праезд. Таму Мертэнс прыйдзецца выбіраць, чаму аддаваць перавагу і на чым эканоміць сродкі: на ежы, сродках гігіены або на зімовым абутку.

З набліжэннем халадоў усё больш еўрапейцаў упадаюць у роспач. Пры гэтым у некаторых рэгіёнах не хапае дроў — «паліва апошняй надзеі». На гэтым фоне зафіксаваны рост злачыннасці, піша газета Washington Post. Так, ашуканцы ствараюць падробленыя вэб-сайты, прайдзісветы выдаюць сябе за гандляроў драўнянага паліва і выцягваюць грошы са спажыўцоў. Таксама пачасціліся выпадкі крадзяжу драўніны.

«Дровы — гэта новае золата», — кажа 62-гадовы жыхар Брэмена Франц Люнінгхейк. Паводле яго слоў, мяркуючы па цяперашніх тарыфах, у наступным годзе рахунак за ацяпленне ў яго выпадку ўзрасце ў тры разы — да 4,5 тысячы долараў (у разліку за год). У такой сітуацыі дровы разглядаюцца як альтэрнатыўнае паліва.

Аб недахопе дроў у Еўрасаюзе ўжо піша агенцтва Bloomberg — вядучы пастаўшчык інфармацыі для прафесійных удзельнікаў фінансавых рынкаў. Пры гэтым попыт на драўніну імкліва расце з-за недахопу газу. Дровы сталі новым эканамічным індыкатарам, сцвярджаюць эксперты арганізацыі Сусветны эканамічны форум (WEF). Нават у Швейцарыі, дзе інфляцыя была адной з самых нізкіх у Еўропе, цэны на дровы ў мінулым месяцы выраслі на 26 працэнтаў. У Польшчы гавораць, што зараз танней ацяпляцца старой мэбляй, чым пакупнымі дровамі. У Нідэрландах запасы ў пастаўшчыкоў драўніны скончыліся яшчэ да канца лета. У Венгрыі былі аслаблены многія забароны на высечку дрэў.

Як паведамляе Bloomberg, на складах, недалёка ад берлінскага аэрапорта, нядаўна ўсталявалі новыя вароты з-за апасення, што ў роспачы людзі могуць выкрасці тавары. Асноўны каштоўны актыў, які захоўваецца там, — дровы. Прычым, як ні дзіўна, такія апасенні зусім небеспадстаўныя. Паведамляецца, што ў Берліне жыхары ссеклі на дровы амаль усе дрэвы ў цэнтральным парку Тыргартэн.

Цэны на драўняныя пелеты ў Францыі амаль падвоіліся — да 600 еўра за тону. Ёсць прыкметы панічнай закупкі гэтага паліва ў свеце. Венгрыя дайшла да таго, што забараніла экспарт пелет, а Румынія на паўгода абмежавала цэны на дровы. Між тым на чаканне дастаўкі дроўных печаў зараз могуць спатрэбіцца месяцы.

Назіраюцца ў Еўропе і прыкметы празмернай скупкі дроў. У французскай кампаніі, якая вырабляе коміны і драўнянае паліва, напрыклад, адзначылі, што некаторыя кліенты купляюць дзве тоны драўняных гранул, хоць, як правіла, менш чым адной тоны дастаткова для абагравання дома на працягу года.

САНКЦЫЙНЫ БУМЕРАНГ

Характэрна, што бурны рост цэн на драўнянае паліва шмат у чым быў арганізаваны еўрапейскімі ўладамі, якія забаранілі ўвоз драўніны і паліўных пелет з Расіі і Беларусі. Прычым наш рэсурс даволі важкі. Паліва для абагравання людзей у Еўропе не можа быць пад санкцыямі, гэта неразумна. Такое меркаванне выказаў БелТА міністр лясной гаспадаркі Аляксандр Кулік. У мінулым годзе арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі выпусцілі 1,5 мільёна куб. метраў піламатэрыялаў, палову з якіх рэалізавалі ўнутры краіны, а палову адгрузілі на экспарт. «Трэба прызнаць, што ўведзеныя супраць галіны санкцыі з боку Еўрапейскага саюза на некаторы час запаволілі работу нашых прадпрыемстваў, але разам з тым не спынілі. Больш за тое, ужо па выніках жніўня мы выйшлі на сярэднямесячны аб'ём адгрузкі піламатэрыялаў 2021 года — 62 тысячы куб. метраў. Прадукцыя была пастаўлена ў дружалюбныя нам краіны. Гэта значыць, сёння мы можам гаварыць аб тым, што задачу пераарыентаваць рынкі збыту мы выканалі. Безумоўна, еўрапейскі рынак быў больш зручны і маржынальны для нас. Але нашы цэхі працуюць, валютная выручка паступае», — расказаў Аляксандр Кулік.

За апошнія гады створана нямала новых пелетных вытворчасцяў. Цяпер у галіне працуе больш за 20 пелетных заводаў і яшчэ некалькі праектаў знаходзіцца на заключнай стадыі рэалізацыі. Дзеючыя прадпрыемствы выпускаюць каля 300 тысяч тон прадукцыі ў год, а пасля ўводу ў эксплуатацыю астатніх плануецца выйсці на аб'ём 450 тысяч тон.

«Не буду хаваць: мы чакаем адкрыцця еўрапейскага рынку, таму што паліва для абагравання людзей не можа быць пад санкцыямі. Гэта абсалютна неразумнае вырашэнне пытання і да палітыкі не мае ніякага дачынення. Кошт тоны пелет у Беларусі зараз складае каля 100 долараў, і гэта цалкам нармальны кошт. Напрыклад, у Польшчы за апошнія месяцы кошт пелет падскочыў да дзвюх тысяч злотых. Для людзей гэта непад'ёмная сума. І мы перакананы, што рана ці позна еўрапейскія палітыкі ўсведамляюць, што санкцыі б'юць перш за ўсё па дабрабыце іх жа грамадзян», — адзначыў кіраўнік Мінлясгаса.

КАЛЯ ВОГНІШЧА

Стары Свет імкліва вяртаецца ў сярэдневечча, сцвярджае ў сваю чаргу і Bloomberg. «Мы вярнуліся да старых часоў, калі людзі не абагравалі ўвесь дом. Яны садзіліся вакол вогнішча, выкарыстоўвалі цяпло ад печы або адкрытага агню і клаліся спаць, — згадвае выканаўчы дырэктар брытанскага аптовага прадаўца дроў Certainly Wood Нік Снэл. — Гэтай зімой такіх небарак будзе значна больш».

Шведскае агенцтва аховы навакольнага асяроддзя выказала занепакоенасць у сувязі з тым, што людзі могуць спальваць у печах і камінах усё, што трапіцца пад руку. Спецыялісты ведамства перасцерагаюць аб высокім узроўні забруджвання ў тым выпадку, калі людзі спальваюць дровы, але не ведаюць, як правільна рабіць гэта. У агенцтве папярэджваюць, што цвёрдыя часціцы могуць трапляць глыбока ў лёгкія і выклікаць інсульты, інфаркты, астму. Асабліва высокая рызыка ў гарадскіх раёнах.

З нявопытнасцю насельніцтва сутыкнуліся і супрацоўнікі нацыянальнай асацыяцыі камінаграў Германіі. Апошнім часам у іх мноства заказаў на падключэнне новых і старых печаў, а кліенты распытваюць аб... спальванні конскага гною і іншых нестандартных відах паліва. Жыхар Берліна, камінар Норберт Шкробек распавёў пра шматлікія рызыкі. Так, няправільна ўсталяваная печ можа прывесці да ўцечак угарнага газу, з-за чаго можа ўзрасці смяротнасць сярод насельніцтва. «Упэўнены, што гэтай зімой некаторых людзей вынесуць з іх дамоў наперад нагамі», — сказаў камінар Норберт Шкробек.

Берлінскі навуковец Вінцэнц Шонфельдэр заявіў, што санкцыі нанеслі насамрэч цяжкі ўдар па Германіі. Між тым амерыканцы, заўважыў эксперт, «назіраюць за тым, што адбываецца з камфортнай адлегласці». Па словах аналітыка Крыстафа Бутэрвегэ, да зімы многія нямецкія хатнія гаспадаркі будуць аддаваць амаль траціну сваіх даходаў на аплату электрычнасці, што падштурхне рост узроўню энергетычнай беднасці. «З'явіцца мноства бедных людзей, якім давядзецца вырашаць: галадаць ім ці мерзнуць», — папярэдзіў Бутэрвегэ.

У ЧАКАННІ ХАЛАДОЎ

Энергакрызіс заўважна змяняе ўклад жыцця жыхароў Еўропы. «У Вялікабрытаніі жыхары, якія маюць патрэбу ў грашах, кідаюць сваіх хатніх жывёл, а школы папярэджваюць, што з-за росту цэн на электраэнергію яны больш не могуць дазволіць сабе куплю новых падручнікаў», — адзначаецца ў артыкуле Washington Post. Выданне нагадвае, што ў Германіі, Вялікабрытаніі, Італіі і Нідэрландах, якія пацярпелі з-за энергакрызісу больш за ўсіх, тарыфы на ацяпленне для жыхароў ўзраслі на 210 працэнтаў.

Еўрапейскія краіны спрабуюць пераадолець дэфіцыт прыроднага газу, пры гэтым абяцаючы фінансавую дапамогу на сотні мільярдаў еўра спажыўцам і прадпрыемствам. Але гэтыя крокі наўрад ці цалкам кампенсуюць павышэнне выдаткаў, таму аналітыкі папярэджваюць аб росце беднасці сярод еўрапейцаў, дзяржаўнага доўгу краін ЕС і яшчэ большым уроне для навакольнага асяроддзя. Між тым у Еўрасаюзе ва ўмовах энергакрызісу ўжо задумаліся, як абысці ўласныя абмежаванні і гарантаваць энергабяспеку. Так, паводле даных агенцтва Bloomberg, Еўракамісія можа паслабіць абмежаванні супраць Расіі і дазволіць перавозку пэўных тавараў. Размова ідзе аб транспарціроўцы вугалю, які павінен гарантаваць энергетычную бяспеку.

Раней аглядальнік выдання Sabah Хасан Басры Ялчын заявіў, што Еўрасаюз усё бліжэй падыходзіць да капітуляцыі перад Расіяй у пытанні газу. Па словах эксперта, Еўропа не можа спадзявацца на дапамогу ЗША. Акрамя таго, еўрапейцам не дапамогуць таксама гіпатэтычныя запасы блакітнага паліва. Аглядальнік Financial Times Рычард Міл заявіў, што Еўропа сутыкнулася з энергетычным крызісам, які «даб'е» кантынент. Ён адзначыў, што незвычайна сухая зіма і вясна прывялі да таго, што запасы вады ў рэзервуарах аказаліся на рэкордна нізкім узроўні. Гэта пагражае тым, што шэраг краін не змогуць забяспечыць свае патрэбы ў электраэнергіі.

Тым часам Еўрапейскі цэнтр сярэднетэрміновых прагнозаў надвор'я папярэдзіў жыхароў Еўропы, што зіма прынясе больш нізкія, чым звычайна, тэмпературы на фоне жорсткага энергетычнага крызісу. Аб гэтым паведаміла ТАСС. Сіноптыкі ўдакладнілі, што чакаецца меншая колькасць ападкаў і вятроў для выпрацоўкі энергіі.

Кіраўнік расійскага холдынга «Газпрам» Аляксей Мілер прагназуе, што ў Еўропе хуткай зімой у пік халадоў могуць замерзнуць цэлыя гарады, паведаміла PIA «Навіны». Між тым кіраўнік расійскага газавага холдынга лічыць, што ў цэлым еўрапейскія краіны змогуць перажыць зіму. Аднак ужо зараз узнікае пытанне, як Еўропа плануе задаволіць попыт на газ у наступным годзе. Становіцца відавочным, што цяперашні энергакрызіс не кароткачасовая з'ява, яго прычыны носяць сістэмны характар.

Мілер таксама з іроніяй выказаўся наконт ініцыятывы ЕС аб увядзенні мяжы цэн на газ з Расіі. «Згадваюцца словы добра вядомай нашай песні — «Потолок ледяной, дверь скрипучая» і далей па тэксце», — заявіў Мілер. Ён адзначыў, што Еўропа не можа прымусіць экспарцёраў газу прадаваць блакітнае паліва па патрэбным ёй кошце. Мілер таксама звярнуў увагу, што эканамічныя поспехі ЕС, у тым ліку Германіі, доўгі час забяспечваліся за кошт танных расійскіх энергарэсурсаў. Таму рост цэн на газавым рынку ставіць пад удар прамысловыя прадпрыемствы ў еўрапейскіх краінах і ў цэлым эканамічную мадэль развіцця Еўропы.

Старому Свету застаецца хіба што на дровах варажыць, ды і тое, калі іх удасца адшукаць.

Захар БУРАК.

Вогненныя вёскі. Нельга забыць

Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца

СКІРМАНТАВА ГАРЭЛА ДЗЕНЬ І НОЧ

Ушчэнт спаленую карнікамі вёску Скірмантава, якая знаходзіцца ў Дзяржынскім раёне, пасля вайны не было каму аднаўляць. У той страшны дзень, калі яшчэ адзін населены пункт Беларусі бязлітасна знішчылі акупанты і іх памагатыя, выжыла ўсяго некалькі чалавек, дый то, таму што на момант трагедыі не было дома. Хаты тут усё ж пабудавалі. Але не тыя, хто спрадвеку жыў на гэтай зямлі. Вёску адраджалі чужыя. Людзям, якія ведалі аб трагедыі з першых вуснаў, было балюча будавацца на папялішчы. Таму паставілі хаты ў іншым месцы — далей ад тых калгасных пабудоў, дзе ад колішніх жыхароў Скірмантава засталіся адзін попел ды косткі...

ЗВЕРСКАЯ РАСПРАВА

Трагедыя здарылася тут 30 (па іншых звестках — 29) ліпеня 1943 года. Нічога не прадвяшчала бяды. Немцы ў вёсцы былі нярэдкімі «гасцямі»: наведваліся сюды перш каб папоўніць свой харчовы запас. Мясцовыя жыхары асцерагаліся такіх візітаў. Тым больш хадзілі чуткі, што то тут, то там фашысты спалілі вёску. Ведалі і аб тым, што на прымусовыя работы ў Германію адпраўляюць моладзь, таму бацькі як маглі хавалі сваіх ужо дарослых дзяцей. Лес, якога навокал было багата, нярэдка станавіўся іх часовым прытулкам. Напярэдадні трагедыі людзі таксама знаходзіліся ў лесе. Карнікі пабылі ў вёсцы і рушылі далей. Калі ўсё сціхла, жыхары вярнуліся ў Скірмантава. Не ведалі яны, што ідуць на сустрэчу са смерцю...

Па дарозе ў вёску Каўшова гітлераўцы сустрэлі групу людзей. Сумненняў не ўзнікла — яўрэі. Гэта былі ўцекачы з Мінскага гета, якія некаторы час хаваліся ў жыхароў Скірмантава. Вяскоўцы далі ім не толькі прытулак, але і апранулі, накармілі, яшчэ і з сабой паклалі хлеба. Бежанцам заставалася толькі дайсці ў партызанскі атрад. Не выйшла... Хлеб у яўрэяў карнікі забралі, перад гэтым выпытаўшы, дзе яны яго ўзялі...

Вярнуўшыся ў Скірмантава, нацысты загадалі людзям збірацца ў калгасных гумнах і хляве — сказалі, што будуць правяраць дакументы. Як толькі жыхары прыйшлі, пабудовы падпалілі. У тых, хто спрабаваў уцякаць, стралялі. Хаты, у якіх жылі людзі, абрабавалі. Скаціну павыганялі з хлявоў. У той час, як у бок Дзяржынска пацягнуліся вазы з нарабаваным няхітрым сялянскім скарбам, адна за адной пачалі ўспыхваць жылыя хаты і гаспадарчыя пабудовы. Неўзабаве ад вёскі нічога не засталося. За кароткі час усе 38 двароў пераўтварыліся ў суцэльнае пажарышча, а людзі — у попел.

Дакладная колькасць загінулых дагэтуль не высветлена. На помніку, устаноўленым на брацкай магіле, пазначана, што «тут пахаваны 144 мірных грамадзян в. Скірмантава, па-зверску знішчаных фашысцкімі захопнікамі 30 ліпеня 1943 года». Па ўспамінах сведак, якія ўдзельнічалі ў пахаванні гэтых бедных людзей, ахвяр было больш. У многіх сем'ях жылі сваякі, якія з-за вайны пазбавіліся свайго жылля, некаторыя хавалі ў сябе бежанцаў, таму арыентавацца толькі на мясцовых жыхароў, кажучы пра колькасць загінулых, абсалютна няправільна.

Па звестках партызан, у Скірмантаве загінула не менш як 180 чалавек. Аб гэтай трагедыі напісалі ў падпольнай газеце «Народный мститель», якая з'яўлялася органам Івянецкага райкама КП(б) Беларусі. «Гітлераўскія каты не так даўно ўчынілі зверскую расправу над мірнымі жыхарамі вёскі Скірмантава Дзяржынскага раёна, — паведамлялася ў публікацыі пад назвай «Зверская расправа». — Атачыўшы вёску, гітлераўскія забойцы пад выглядам праверкі дакументаў сабралі ўвесь народ у некалькіх хатах, а затым падпалілі іх. У агні згарэла 180 нявінных сялян і сярод іх больш 50 дзяцей. Абрабаваўшы вёску, нямецкія людаеды да тла спалілі яе».

«КУДЫ МАМА, ТУДЫ І Я»

Гэты важны дакумент гісторыі — падпольная газета, у якой паведамляецца пра пагібель вёскі, — захоўваецца ў хатнім архіве Зінаіды Леванец. Зінаіда Пятроўна — адна з тых жыхароў вёскі, якім пашчасціла не апынуцца ў тым жудасным вогнішчы, распаленым фашыстамі. Мы сустрэліся ў яе мінскай кватэры. Мне адчыніла дзверы вельмі прыгожая жанчына. Столькі ў яе вачах цеплыні, дабрыні. Падалося, што яна ўся свеціцца шчасцем. Аднак як толькі завялі гутарку пра вайну, пра той самы страшны дзень у яе жыцці, твар рэзка памяняўся. У вачах Зінаіды Пятроўны з'явілася столькі болю, столькі нявыплаканых слёз, якіх, напэўна, і жыцця не хопіць выплакаць.

Яна расказала, што да вайны Скірмантава было звычайнай вёскай: невялікая, але і не на некалькі двароў. Людзі будавалі жыллё, працавалі на зямлі, трымалі гаспадарку, стваралі сем'і, гадавалі дзяцей. З прыходам акупантаў жыццё быццам спынілася. Сяляне жылі ў пастаянным страху быць асужанымі нацыстамі, якія часта наведваліся ў вёску.

Сям'я, у якой расла Зінаіда, была вялікая: бацькі і пяцёра дзяцей (два сыны і тры дачушкі). Яна — перадапошняя, 1935 года нараджэння. Усе дзеці ў гэтай сям'і нараджаліся з розніцай у два гады. Бацька, удзельнік Грамадзянскай вайны, кульгаў, таму на фронт яго не ўзялі. Знайшлося прымяненне яго ўменням і ў акупацыі. Пётр Рыгоравіч быў добрым шаўцом, таму рамантаваў абутак для партызан. А маці Зінаіды, Аляксандра Данілаўна, з'яўлялася сувязной партызанскага атрада, пякла для народных мсціўцаў хлеб.

У той дзень, калі ў Скірмантаве здарылася трагедыя, Аляксандра Міскевіч разам з многімі аднавяскоўцамі адправіла сваю старэйшую дачку ў лес — баялася, што 15-гадовую дзяўчыну забяруць у Германію. На адной з пяці падводаў, якія накіроўваліся з вёскі, паехала і сама.

— *Я раптам вырашыла: куды мама, туды і я,* — успамінае Зінаіда Леванец. — *Бацька спрабаваў за мной бегчы. Я гэтыя падводы дагнала амаль каля лесу. Бацька мяне так і не спыніў, я засталася з мамай. У суседняй вёсцы Якуты знаходзіліся немцы. Мама вырашыла даведацца, што яны там робяць. Мы пакінулі маю старэйшую сястру з аднавяскоўцамі ў лесе і ўдваіх з мамай пайшлі ў Якуты. Вярнуцца ў лес нам ужо было нельга. А тыя не дачакаліся нас і паехалі ў Скірмантава. Немцы ўбачылі людзей, падумаўшы, што гэта партызанскі абоз, пачалі страляць. Людзі кінулі коней і ўсё астатняе ў лесе і вярнуліся ў вёску. Усе загінулі...*



Школьнікі рэгулярна наведваюць як могілкі спаленай вёскі, так і мемарыял, пастаўлены ў памяць аб усіх жыхарах Скірмантава, каго забрала вайна.

«МНОГІЯ ТРУПЫ АПАЗНАЦЬ БЫЛО НЕЛЬГА...»

З Якутаў, якія знаходзіліся дзесьці за пяць кіламетраў ад Скірмантава, маленькая Зіна з мамай бачылі, як гарэла іх вёска. *«Гэта было зарыва,* — не можа забыць тое жудаснае відовішча Зінаіда Леванец. — *Мы ведалі, што гэта наша вёска гарыць. Як толькі немцы пайшлі з Якутаў, рушылі ў той бок. Выйшлі з лесу і ўбачылі, што няма вёскі. Прыйшлі на папялішча, а там толькі коміны ды печкі...»*

Зінаіда Пятроўна і цяпер памятае, дзе стаяла іх хата, расла ліпа з гняздом — буслы ўвесь час туды прыляталі. Дагэтуль у вачах і самае страшнае — яна, васьмігадовая дзяўчынка, разам з маці разграбаюць астанкі — шукаюць сваіх. *«Немагчыма ўявіць, які гэта жах,* — кажа яна. — *У маім дзіцячым уяўленні гэта настолькі захавалася, што пераследавала — не ведаю — колькі часу. Калі расцягвалі астанкі, бацька ляжаў папярок траіх дзяцей — напэўна, закрываў іх сабой. У іх былі абгарэлыя рукі, а адзенне захавалася — па ім і пазналі родных. Загарнулі астанкі ў нейкую прасціну (не ведаю, дзе яе ўзялі) і ў агульную магілу паклалі. Вось такое пахаванне».*

З сям'і Міскевічаў загінулі чатыры чалавекі: бацька і трое дзяцей. Пакутніцкую смерць прынялі і іх сваякі. Двое дзяцей стрыечнага брата гаспадыні па прозвішчы Нагібовічы на момант трагедыі знаходзіліся ў Міскевічаў у гасцях. Мама і сын Сакулевічы (жонка і дзіця роднага брата Аляксандры Міскевіч) жылі ў іх, бо ў Мінску, адкуль яны прыехалі, гэта было немагчыма. Восем чалавек з адной радні спачываюць цяпер у брацкай магіле.

— *Мама казала, што ўсяго ў Скірмантаве спалілі 243 чалавекі,* — сведчыць Зінаіда Леванец. — *Многія трупы апазнаць было нельга...*

Яны былі ўпэўнены, што сярод іх — і брат Зіны, Саша. Пасля пахавання пайшлі ў вёску Мілашы. Раптам пачулі: «Мама!» Аляксандра Міскевіч ледзьве не страціла прытомнасць. Яшчэ адно дзіцятка! Жывое! Аказваецца, хлопчык, якому таксама пашчасціла не трапіць у тыя гумны, дзе палілі аднавяскоўцаў, хадзіў па папялішчы і плакаў. Ён таксама думаў, што ўсе яго блізкія загінулі. Не ведаў, куды яму ісці. Знайшліся добрыя людзі і падказалі, што мама з сястрычкай выжылі, паведамілі, дзе іх шукаць.

«КРЫКІ ЧУЛІСЯ ДОЎГА»

У той страшны дзень, калі карнікі палілі Скірмантава, дзесяцігадовы Саша Міскевіч разам з адной дзяўчынкай пасвіў кароў.

— *Як потым расказваў брат, бацька мог выратавацца: ён, інвалід, у гумно, дзе палілі людзей, ішоў самы апошні,* — сведчыць Зінаіда Леванец. — *Немцы былі ўжо там. Саша паклікаў іх: «Бацька, Жэня і Люба, ідзіце сюды». Тата сказаў, што трэба дакументы праверыць, усіх жа завуць, і пайшоў на смерць, хоць была магчымасць схавацца. Але, напэўна, лёс...*

Разам з Аляксандрам пасвіла кароў Раіса Куніцкая. Вось як узгадвала тыя падзеі яшчэ адна сведка трагедыі: *«Усё пачалося гадзін у 9-10 раніцы. Зрабіўшы сваю справу, паліцаі накіраваліся ў бок Дзяржынска, а каля хлявоў раздаліся стрэлы. Я хацела паглядзець, што там адбываецца і выглянула з-за вугла. Мяне ўбачыў паліцай і закрычаў: «Чаму ты тут? Чаму не пайшла з астатнімі?» Я яму адказала, што мне загадалі сцерагчы кароў. Як толькі паліцай адвярнуўся, мы пабеглі ў жыта, што расло непадалёку. Жыта было мала і невысокае, нам прыйшлося ляжаць ніцма і не варушыцца. Вакол палоскі жыта быў луг, па якім нехта праскакаў на кані. Пачалі паліць хлявы. Немцы вельмі сварыліся і лаяліся па-руску. Мы пачулі аўтаматныя і кулямётныя чэргі. Людзі закрычалі, загаласілі. Некалькі выбухаў раздалося, як быццам бы страляюць з мінамётаў. Пабудовы гарэлі, вецер разносіў палаючую салому, пачало дыміцца жыта. Навокал стаяў чалавечы крык, нават не крык, а страшэнны лямант і выццё. Крыкі доўга было чуваць, пасля ўсё заціхла».*

Саша і Раіса падняліся, агледзеліся: немцаў нідзе не было. Дзеці папаўзлі ў бок вёскі. Скірмантава дагарала. Напалоханыя, яны забраліся ў яму, дзе зімой захоўвалі бульбу, і прасядзелі да цемры. Там ім згадалася, што, калі людзей гналі да хлявоў, да іх забегла Сашава сястра і сказала: «Нас паб'юць, а вы астаняцеся. Тата выпаліў у печы і паставіў хлеб. Будзеце яго есці». Дзеці вылезлі з укрыцця і пайшлі да сядзібы Міскевічаў. Ужо цяжка было знайсці, дзе яшчэ ўчора жылі людзі. Папялішчы былі амаль аднолькавыя. Раіса Куніцкая ўспамінала, што Саша ўвесь час плакаў і прасіў есці.

«Мы пачалі хадзіць па дварах і знайшлі на адным агародзе радыску, — успамінала Раіса Паўлаўна. — Селі каля ямы, нашай схованкі, і пачалі есці. Так і праседзелі ўсю ноч да раніцы. Хлеў і гумны дыміліся ўсю ноч, стаяў страшэнны пах гарэлага мяса. Было вельмі страшна. Нам не верылася, што ў вёсцы няма больш нікога жывога. Раніцай мы пайшлі шукаць людзей. Па вуліцы блыталіся абгарэлыя куры і каты. Куры ад нас разляталіся ва ўсе бакі, а каты ішлі следам. Мы падышлі да хлява. Там усё згарэла дашчэнту, засталіся толькі груды попелу. Падышлі да гумна. У нос ударыў удушлівы пах гарэлага мяса. Сярод галавешак ляжалі абгарэлыя чалавечыя трупы, наваленыя адзін на адзін. Мы спалохаліся і пабеглі. Каля могілак убачылі людзей. Гэта жыхары навакольных вёсак ішлі даведацца аб лёсе сваіх родных і сваякоў».

Хаваць астанкі па старадаўнім звычаі вырашылі на трэці дзень пасля трагедыі. На скірмантаўскае папялішча папрыходзілі жыхары навакольных вёсак. Колішніх гаспадароў гэтай зямлі паклалі ў яе ж — свой апошні прытулак яны знайшлі ў некалькіх брацкіх магілах. Некаторых з тых, каго апазналі родныя, пахавалі асобна.

«Я добра ведала, хто з вяскоўцаў як быў апрануты ў той дзень, — сведчыла пасля вайны Раіса Куніцкая. — *Патрэбна было апазнаць трупы. У хляве згарэлі ўсе людзі, бо там было шмат сухой саломы. Засталіся толькі косці. У гумне пад грудамі галавешак і попелу ляжалі людзі без рук, ног, галавы. Знайшлі абгарэлага мужчыну без галавы і рук. Па адзенні, якое засталося, я пазнала свайго бацьку. Пад бацькам ляжала мая малодшая сястра, таксама абгарэлая, а яшчэ ніжэй — мой брацік, цэлы, але ўвесь чорны. Збоку ад іх знайшлі маму. Яна трымала на руках маленькую сястрычку, якой было ўсяго тры месяцы. Яшчэ адну маю сястру так і не знайшлі. У самым кутку гумна ляжала дзяўчынка, уся скручаная. Магчыма, яна гарэла і спрабавала выпаўзці па сценах. Тыя трупы, якія ляжалі пад верхнімі, абгарэлымі, былі цалейшымі. Іх родныя апазнавалі і хавалі на могілках».*

«ПА РУКАХ ЦЁК ЧАЛАВЕЧЫ ТЛУШЧ...»

У асобнай магіле членаў сваёй сям'і пахавалі і сёстры Мірановіч. Траім дзяўчатам — Веры, Марыі і Галіне — таксама пашчасціла не быць дома ў той страшны дзень. Сёстры знаходзіліся на палетках каля лесу: штодзень вісела пагроза іх адпраўкі на прымусовыя работы ў Германію. На палетках яны не толькі хаваліся, але і працавалі: палолі, жалі траву, затым яе сушылі і вазілі дахаты. Ноччу дзяўчаты часта начавалі на сенавале. У той трагічны дзень сёстрам вельмі не хацелася нікуды ісці, але маці сказала: «Ідзіце, дачушкі, не будзьце дома, мне прысніўся дрэнны сон. Як бы не здарылася нічога дрэннага». І як у ваду глядзела.

«Мы паслухаліся сваю маму, сабраліся і пайшлі ў лес, — распавядала пасля вайны Вера Гурук (у дзявоцтве Мірановіч). — *Крыху адышлі ад хаты, і ўсё нас штосьці трывожыла. Марыя прапанавала вярнуцца дахаты, але я і Галя не пагадзіліся. Я сказала сёстрам, што вяртацца нельга, бо мама сказала, што прысніўся страшны сон, можа, гэта і праўда».*

Дзесьці пасля 12 гадзін дня дзяўчаты пачулі з боку вёскі крыкі, адчулі пах дыму. *«Затаіўшы дыханне, мы пабеглі бліжэй да краю лесу, — узгадвала сведка трагедыі. — Ад таго, што мы ўбачылі, замерлі нашы сэрцы. Абняліся ўтрох, сядзім і не ведаем, што рабіць. У вёску ходу няма, уся вёска гарыць такім жудасным полымем, раздаецца такі жудасны крык і плач людзей. Мы плачам і ўспамінаем маму, якая нас выратавала. Сядзелі ў лесе да цемры. У вёсцы ўсё гарэла, трашчала, стаяў такі высокі слуп агню і дыму, што, здавалася, і сонца гарыць, а яно ў гэты дзень так ярка свяціла, як быццам ведала, што свеціць бедным жыхарам Скірмантава апошні раз. Вечарам падышлі блізка да вёскі, але там ужо нічога не было, толькі ўсё дагарала. Падумалі, дзе нам дзявацца, бо засталіся, як стаім: ні ежы, ні адзення. Пайшлі ў суседнюю вёску, там праплакалі ўсю ноч».*

Плакалі па маці, па пляменніку, якому было ўсяго два гадкі... Раніцай, як толькі крыху развіднела, дзяўчаты пабеглі ў вёску — дакладней у тое, што ад яе засталося. Ад жаху, які ўбачылі, падкошваліся ногі. Яшчэ больш страшнае чакала іх на наступны дзень, калі яны хавалі сваіх родных, аднавяскоўцаў. З успамінаў Веры Гурук: *«Недалёка ад тых адрын, дзе згарэлі людзі, выкапалі шэсць ям і пачалі разграбаць гэтае страшнае месца. Закасалі рукавы і рукамі збіралі ўсё, што засталося. Рукі былі чорныя, і па руках цёк чалавечы тлушч. Зверху былі адны недагарэлыя косці, іх скідалі ў адну яму. Недалёка было пасеяна жыта, так накасілі гэтага жыта і засцілалі ямы жытняй саломай. Людзі, якія былі наверсе, згарэлі зусім, толькі можна было адрозніць, што гэта не агаркі бярвення, а людскія косці. Усё гэта рабілі хутка, бо баяліся немцаў. Людзей, хто апынуўся ўнізе, можна было апазнаць. Мы апазналі свайго бацьку па адзенні: у пінжаку, у сярэдняй кішэні, ляжаў пашпарт і фатаграфія. Пасля знайшлі маці, дзвюх сясцёр і двух братоў, маленькі двухгадовы пляменнік ляжаў пад імі. Яшчэ адна сям'я знайшла сваіх сваякоў: бацька, маці і шасцёра дзяцей. Мы пахавалі іх усіх разам у адной магіле і паставілі крыж. Куніцкія таксама апазналі сваіх пяцярых родных і пахавалі асобна. Астатніх пахавалі ў чатырох магілах, усіх, каго знайшлі: і цэлыя, але неапазнаныя, і зусім астанкі. Кожную магілу зверху закрывалі саломай і засыпалі зямлёй. Паставілі крыжы без подпісаў, бо не ведалі, хто дзе пахаваны».*

У ПАМЯЦІ НОВЫХ ПАКАЛЕННЯЎ

У пахаванні жыхароў Скірмантава, якія загінулі жудаснай смерцю, удзельнічала і бабуля Нэлі Янкоўскай, бібліятэкаркі Скірмантаўскай сельскай бібліятэкі.

— *Мая маці і бабуля, якія жылі ў суседняй вёсцы Вертнікі, кіламетры чатыры ад Скірмантава, бачылі дым, які ішоў ад вёскі,* — распавядае Нэлі Янкоўская. — *Надвор'е было вельмі добрае, смуродны дым хутка разносіўся: гэта не тое, што адзін ці два чалавекі. Колькі гарэла людзей! Назаўтра маці з бабуляй пайшлі ў Скірмантава, каб паглядзець, што здарылася. На трэці дзень разам з людзьмі з навакольных вёсак хавалі астанкі. Гэта было вельмі страшна... Людзі расказвалі, недзе сядзела мёртвае дзіцятка з абгарэлымі пальчыкамі, з якіх капаў тлушч. Вельмі жудаснае відовішча. Бабуля мая амаль ніколі аб гэтым не расказвала.*

Побач з брацкай магілай — асобныя пахаванні жыхароў вёскі, якіх апазналі сваякі.

Затое аб трагедыі цяпер распавядае яна, бібліятэкар Скірмантаўскай сельскай бібліятэкі. Пераважна школьнікам, моладзі, якая наведвае мясцовы музей у Скірмантаўскім доме культуры. Тэме Вялікай Айчыннай вайны тут прысвечана грунтоўная экспазіцыя — у свой час аб яе стварэнні паклапаціўся бацька Нэлі Янкоўскай. Ён, былы партызан, выкладаў у мясцовай школе гісторыю. У многім дзякуючы Сяргею Сіпачу ў Скірмантаве з'явіўся музей.

Самы вялікі экспанат — макет даваеннай вёскі. Гледзячы на яго, можна ўявіць, як выглядала Скірмантава да таго, як было спалена. Макет стваралі выкладчыкі і студэнты ўніверсітэта культуры. Узнавіць, як выглядала вёска, дапамаглі людзі, якія перажылі гэтую трагедыю, жыхары навакольных вёсак. Дзякуючы ім быў адноўлены і спіс загінулых — няпоўны, ён таксама прадстаўлены ў музеі. У кагосьці адсутнічае імя, пазначана толькі прозвішча: калі дарослых памяталі, то, як звалі некаторых дзяцей, пазабываліся.

Нягледзячы на тое, што насельніцтва сучаснага Скірмантава невялікае, музей рэдка калі пустуе. «Летам да нас прыязджала сям'я, — згадвае Нэлі Янкоўская. — Мужчына вельмі хацеў трапіць у музей. Яго цесць некалі жыў у Скірмантаве, тут загінула яго сястра з сям'ёй».

Рэгулярна наведваюць музей і школьнікі. Яны і самі, як добрыя экскурсаводы, могуць расказаць, што за трагедыя здарылася ў вёсцы летам 1943 года. Як распавяла бібліятэкар «Скірмантаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу яслі-сад — сярэдняя школа» Вольга Анпілогава, школьнікі рэгулярна звяртаюцца да чорнага перыяду з гісторыі населенага пункта, у свой час нават правялі даследчую работу.

— Пра трагедыю, якая адбылася ў Скірмантаве ў вайну, мы даведаліся адразу ж, як пайшлі ў школу, — заўважае вучаніца сёмага класа Аліса Сіман. — Тут заўсёды захоўвалася памяць аб тых падзеях. Цяпер мы, маладое пакаленне, павінны берагчы памяць аб людзях, якія загінулі.

З ёй пагаджаюцца і аднакласнік дзяўчынкі Мікіта Харужык, а таксама Уладзімір Міроненка, які вучыцца ў шостым класе. У Валодзі вочы на мокрым месцы. Вядома ж, дзіця. Тут і дарослым цяжка стрымаць эмоцыі, калі чуеш гэтую гісторыю.

Разам са школьнікамі мы наведалі помнік аднавяскоўцам, якія загінулі на фронце і былі спалены ў агні. Першапачаткова ён, невялічкі і сціплы, знаходзіўся ў двары школы. Цяпер міма яго не пройдзе ні местачковец, ні выпадковы спадарожнік — абеліск у памяць аб загінулых размясціўся на цэнтральнай плошчы Скірмантава. Недалёка ад яго — і могілкі спаленых жыхароў. Астанкі людзей, якія першапачаткова былі пахаваны побач з месцам трагедыі, перанеслі сюды ўжо пасля вайны. Такім чынам, і брацкая магіла, і асобныя пахаванні апазнаных жыхароў цяпер знаходзяцца ў адным месцы.

Напэўна, часцей за ўсіх тут бывае Яўгенія Лебедзева. Жанчыну па праве можна назваць старажылам сучаснага Скірмантава: яе сям'я адна з першых будавалася на месцы спаленай вёскі. Хата Яўгеніі Іосіфаўны знаходзіцца амаль насупраць могілак. Заходзіць сюды пры любой магчымасці. Яна ведае пра той чорны дзень у гісторыі вёскі з першых вуснаў: была знаёмая з Раісай Куніцкай, якой пашчасціла выжыць. А яшчэ Яўгенія Лебедзева памятае, як даведалася аб трагедыі.

У адзін цудоўны сонечны спякотны дзень мама панесла на раку адбельваць два доўгія кавалкі палатна і ўзяла мяне і маю малодшую сястру, — расказвае жанчына. — Калі яна даставала палатно з вады, мы ёй дапамагалі слаць яго на траву. Мама пакінула нас вартаваць палатно, а сама пайшла дадому даіць карову. Гэта было бліжэй да абеду. Мы з сястрой пахадзілі крыху па рацэ, нарвалі кветак і леглі на траву. Глядзім, нейкія вялікія чорныя камары лётаюць і ўсё валяцца на адбеленае палатно. Прыгледзеліся больш уважліва, а гэта аказаліся не камары, а недагаркі саломы і дрэва. Аказалася, што ў гэты дзень, такі цудоўны і сонечны, гарэла Скірмантава. Наша вёска была за дзесяць кіламетраў ад яе».

ЗДРАДНІК ПРАСІЎ ПРАБАЧЭННЯ

Пакаранне за злачынства ў Скірмантаве панёс толькі адзін чалавек — жыхар вёскі па прозвішчы Мірановіч. *«Ён, настаўнік да вайны, аказаўся здраднікам: прысутнічаў, калі вёску палілі,* — расказвае Зінаіда Леванец. — *Яго бачыла дзяўчына, якая хавалася ў бульбе разам з маім брацікам. Каб не засталося жывых сведак, ён ганяўся за мамай. Пасля трагедыі нас прытуліла адна сям'я ў вёсцы Лісаўшчына. Гаспадар вазіў здаваць збожжа ў раён. Аднойчы яго пабілі да паўсмерці — хтосьці паведаміў здрадніку, што мама жывая і хаваецца ў іх. Конь прывёз пабітага гаспадара дахаты, і ён сказаў, каб мама неадкладна сыходзіла. Мы пайшлі ў партызанскі атрад. Да самага вызвалення жылі ў Налібоцкай пушчы».*

Пасля вайны лёс звёў маці Зінаіды Леванец са здраднікам твар у твар. Просячы міласціну (не было нічога ні піць, ні есці), жанчына дайшла да Івянца і ўбачыла яго там. Высачыла, куды пайшоў, спыталася ў людзей, хто ён, і анямела ад пачутага: Мірановіч узначальваў Івянец. Аляксандра Міскевіч падала на яго ў суд. Здраднік панёс пакаранне. Праўда, замест 25 гадоў, якія былі прысуджаны першапачаткова, адседзеў дзесяць. Пасля таго як выйшаў на волю, сустрэўся з Аляксандрай Данілаўнай на чужым вяселлі, прасіў у яе прабачэння: казаў, што гэта была вайна...

Аднак ці можна такое дараваць? Ці можна забыцца пра ўвесь той жах, які ўчынілі над мірнымі беларусамі нацысты? Ці можна здрадзіць памяці ні ў чым невінаватых людзей, яшчэ ненароджаных дзяцей? Адказ — відавочны.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.
Дзяржынскі раён.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «**Беллифт**» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **изолированного помещения с инв. № 612/D-23358 (наименование – диспетчерский пункт) общей площадью 56,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Калиновского, д. 30, корп. 2, кв. 1.**

Помещение находится на 1-м этаже 9-этажного 71-квартирного жилого дома.

Сведения о земельном участке: кадастровый номер 641300000001000051, площадью 0,4655 га, право аренды.

Начальная цена с НДС (20 %) – **106 352,87** бел. руб. *(Начальная цена снижена на 20 %)* (задаток 10 % от начальной цены – **10 635,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 10.06.2022, 28.07.2022, 02.09.2022.

Аукцион состоится **26.10.2022** в **15.00** по адресу: г.Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.10.2022** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра: (8029) 607 95 28.**

УНП 190241053

РУП «Институт недвижимости и оценки»

(Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ООО «СНБ-Агро»** на праве собственности (Продавец)

Аукцион состоится **15.11.2022 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Лот № 1: квартира в блокированном жилом доме, инв. № 601/D-9988, 62,4 кв. м. Адрес: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, аг. Калачи, ул. Центральная, 39-1. Начальная цена без НДС – 47 463,87 руб. Задаток – 4 746,39 руб. Шаг аукциона – 5 %. Штраф – 20 % от начальной цены.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 11.11.2022 в 11.00.

☎ Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

ООО «Деловая оценка»
(организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 25 октября 2022 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

ЛОТ № 1: изолированное помещение (назначение – торговое помещение, наименование – магазин) с инв. № 350/D-126579, общей площадью 1025,2 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340165500001000005 площадью 0,1361 га (доля в праве 74/100) по адресу: Гомельская область, г. Гомель, ул. Беляева, 5-65. **Начальная цена продажи** с НДС: **1 514 160,00** бел. руб. **Задаток (10 %)** с НДС: **151 416,00** бел. руб.

Обременение: заключен договор аренды от 27.04.2022 г. № 59 с ООО «ЕВРОТОРГ» на срок до 26.04.2027 г.

Продавец: ОАО «Табаквинторг», г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Конт. тел.: +375-44-599-02-90, +375-232-25-26-46.

Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB30124055581000000933 в ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений заканчивается 24.10.2022 г. в 16.00. Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; стоимость должна быть выплачена в следующем порядке: **20 %** от стоимости в течение **15 календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи; **30 %** от стоимости в течение **30 календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи; **50 %** от стоимости в течение **45 календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод» информирует о том, что 17.11.2022 года состоятся первые электронные торги по продаже имущества:

цепь тяговая бутылконосителей;
стол загрузки, установленный на бутылкомоечной машине;
автомобиль «ЛАЗ 695», тип ТС – автобус-салон, год выпуска – 1993, рег. знак ТВ 1346;
автомобиль «ГАЗ 5312»,тип ТС – грузовой фургон, год выпуска – 1989, рег. знак АА 6110-6;
автомобиль «ZIL», тип ТС-грузовой бортовой, год выпуска – 1981, рег. знак АА 6873-6;
автомобиль «МАЗ 54323», тип ТС – грузовой седельный тягач, год выпуска – 1994, рег. знак ТМ 3119;
автоцистерна МАЗ, год выпуска – 1976;
трактор «Беларус 320.4», год выпуска 2011, рег. знак 1432 ТВ-6;
трактор «Беларус 82», год выпуска не установлен.

С информацией об условиях проведения электронных торгов можно ознакомиться на сайтах: torgi.gov.by и bankrot.gov.by.

УНП 700103211

Могилевский филиал РУП
«Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис».

Аукцион состоится 16.11.2022 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

Лот № 1: **седельный тягач Мерседес-Бенц 1838,** р/з ТМ 3741, г. в. 1995. Начальная цена продажи – 18 600,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 860,00 бел. руб.

Лот № 2: седельный тягач Мерседес-Бенц 1838, р/з ТМ 4431, г. в. 1992. Начальная цена продажи – 18 600,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 860,00 бел. руб.

Лот № 3: седельный тягач MAZ 642205-221RB, р/з АЕ 9938-6, г. в. 2008. Начальная цена продажи – 21 600,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 2 160,00 бел. руб.

Лот № 4: седельный тягач MAZ 642205-220P, р/з ТС 0036, г. в. 2007. Начальная цена продажи – 17 280,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 728,00 бел. руб.

Лот № 5: седельный тягач MAZ 642205-221PБ, р/з АВ 0400-6, г. в. 2009. Начальная цена продажи – 16 560,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 656,00 бел. руб.

Лот № 6: седельный тягач MAZ 555102 225, р/з ТВ 2382, г. в. 2005. Начальная цена продажи – 10 800,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 080,00 бел. руб.

Лот № 7: седельный тягач MAZ 642205-221PБ, р/з АЕ 0817-6, г. в. 2008. Начальная цена продажи – 12 480,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 248,00 бел. руб.

Лот № 8: грузовой автомобиль MAZ 555142-4227RBH в комплекте с передним отвалом НО-72-01 для уборки снега, р/з АЕ 9946-6, г. в. 2006. Начальная цена продажи – 20 520,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 2 052,00 бел. руб.

Лот № 9: грузовой автомобиль MAZ 555142-4227RBH, р/з АЕ 9941-6, г. в. 2006. Начальная цена продажи – 18 120,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 812,00 бел. руб.

Лот № 10: грузовой автомобиль ГАЗ-5312 (мусоровоз, ассенизационный), р/з ТМ 8269, г. в. 1986. Начальная цена продажи – 9 120,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 912,00 бел. руб.

Лот № 11: грузовой автомобиль ГАЗ-3307 (ассенизационный), р/з АІ 0528-6, г. в. 1993. Начальная цена продажи – 5 400,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 540,00 бел. руб.

Лот № 12: грузовой автомобиль УАЗ 452Д, р/з ТВ 2584, г. в. 1983. Начальная цена продажи – 4 080,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 408,00 бел. руб.

Лот № 13: легковой автомобиль VAZ-21154-120-20, р/з 3636 ВР-6, г. в. 2010. Начальная цена продажи – 5 040,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 504,00 бел. руб.

Лот № 14: полуприцеп Van Hool, р/з Т 0842 А, г. в. 1994. Начальная цена продажи – 10 440,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 044,00 бел. руб.

Лот № 15: полуприцеп Van Hool, р/з 0523 ТА, г. в. 1994. Начальная цена продажи – 10 200,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 020,00 бел. руб.

Лот № 16: полуприцеп Van Hool, р/з 2713 ТА, г. в. 1989. Начальная цена продажи – 12 480,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 248,00 бел. руб.

Лот № 17: полуприцеп MAZ 93866, р/з 1130 АА-6, г. в. 1994. Начальная цена продажи – 12 120,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 1 248,00 бел. руб.

Лот № 18: полуприцеп ОДАЗ 9958 (скотовоз), р/з 1065 АА-6, г. в. н/у. Начальная цена продажи – 4 920,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 492,00 бел. руб.

Лот № 19: полуприцеп ОДАЗ 9958 (скотовоз), р/з 2413 ТА, г. в. 1988. Начальная цена продажи – 5 520,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 552,00 бел. руб.

Лот № 20: полуприцеп ОДАЗ 9958 (скотовоз), р/з 0879 ТВ, г. в. 1990. Начальная цена продажи – 5 520,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 552,00 бел. руб.

Лот № 21: полуприцеп ОДАЗ 9958 (скотовоз), р/з 2557 АА-6, г. в. н/у. Начальная цена продажи – 5 520,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 552,00 бел. руб.

Лот № 22: полуприцеп ОДАЗ 9958 (скотовоз), р/з 6406 ТА, г. в. 1990. Начальная цена продажи – 4 560,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 456,00 бел. руб.

Лот № 23: полуприцеп Van Hool, р/з 0524 ТА, г. в. 1994. Начальная цена продажи – 9 360,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток – 936,00 бел. руб. Местонахождение лотов: г. Могилев, ул. А. Павлова. 7.

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа – 40901. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by. Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by

Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

2 ноября 2022 г. проводит повторный открытый аукцион № 14-У-22 с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).

Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на земельном участке в г. Минске, предоставляемом в аренду сроком на 5 лет

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.	Наличие обременений	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск, ул. Бабушкина, 29	1,2	Для строительства объекта «Объект производственного назначения в промузле Колядичи в районе ул. Бабушкина, 29. Участок № 2»	29 659,50	5 930,00	14 233,42	Снос объектов недвижимого имущества, попадающих под пятно застройки, в т. ч. 3 (три) складских здания, многолетние насаждения, металлический забор, ж/б ограждение, асфальтированная площадка	101 296,20

Возмещение убытков производится лицами, которым предоставляется изымаемый земельный участок.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанном земельном участке и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участка осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **2 ноября 2022 г. в 16. 00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток не позднее 27 октября 2022 г. в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, код платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 14-У-22;

представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов для участия в аукционе предъявляют:

заявитель (его представитель) – документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия;

уполномоченное лицо (его представитель) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе;

представитель уполномоченного лица – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу:

г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 2 с 17 октября 2022 г. по 27 октября 2022 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам до 16.00).

Торги в отношении земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под подпись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

Оплата стоимости за право заключения договоров аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договоров аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения), Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельному участку (в том числе с характеристиками расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон + 375 (17) 363-96-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі

Было відаць, з якім задавальненнем Прэзідэнт агледзеў вучэбную базу. Усёй маёмасцю, што засталася ад папярэднікаў, гарадскія ўлады і кіраўнікі распарадзіліся надзвычай па-гаспадарску. Аляксандр Рыгоравіч сустрэўся з выкладчыкамі і студэнтамі, агледзеў макет кампуса, паабяцаў сур'ёзную падтрымку ў развіцці ўніверсітэта. Мы ўсе разам закладлі каля ўніверсітэта раўнюткую алею з маладых дубкоў. І Прэзідэнт на сваім верталёце падняўся ў паветра. Ва ўсіх быў вельмі прыўзняты, святочны настрой. І раптам у Анатоля Афанасьевіча Тозіка зазвінеў мабільны тэлефон. Ён адразу напружыўся:

— Прэзідэнт звоніць!

Пасля нядоўгай размовы з Прэзідэнтам Анатоль Афанасьевіч звяртаецца да мэра горада Дзічкоўскага:

— Прэзідэнт пытаецца, што ў вас там за даўгабуд такі на ўскраіне горада? Ён з верталёта ўбачыў, што там на недабудаваным будынку ўжо нават бярозкі прараслі. Даручыў разабрацца. І калі заказчыкі будаўніцтва не здольны яго завяршыць, то варта перадаць гэты будынак універсітэту і неадкладна дабудаваць!

— Гэта Міністэрства аховы здароўя яшчэ гадоў дзесяць назад запланавала ў нас будаўніцтва Рэспубліканскага дзіцячага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі, а пасля ад ідэі адмовілася, — адразу ж патлумачыў сітуацыю Віктар іванавіч Дзічкоўскі.

— І будоўля канчаткова спынілася?

— Так! У гэты праект ужо ўкладзены немалыя сродкі і ў такім выглядзе ён у нашым горадзе нікому непатрэбны.

— Тады паехалі, паглядзім усё на месцы.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня; 1, 8 кастрычніка.)

Мала таго, што будоўля знаходзілася ў самым непрыглядным стане і там даўно ўжо будаўнікі нават не з'яўляліся, да таго ж архітэктура будынка разлічана была на доўгія калідоры з маленькімі кабінетамі для прыёму хворых і велізарную, у выглядзе амфітэатра, залу для кансіліумаў. Мы з рэктарам напружыліся. Планіроўка будынка ніяк не адпавядала вучэбным мэтам. А ў нас жа задуманы кампус, для яго ўжо ёсць праект, там прадугледжаны прыгожы вучэбны корпус і побач тры студэнцкія інтэрнаты, мы яго паказалі Прэзідэнту і атрымалі згоду на будаўніцтва. Я стаў рашуча пярэчыць, Васіль Іванавіч Качурка мяне падтрымаў, вопыт у яго ў такіх справах быў немалы. І губернатару Сумару, і мэру Дзічкоўскаму было, канешне ж, выгадна дабудаваць гэты будынак за кошт рэспубліканскага бюджэту, таму яны былі за тое, каб перадаць будоўлю ўніверсітэту, а значыць, пад эгіду Міністэрства адукацыі. Разумеючы складанасць будучых рашэнняў, Анатоль Афанасьевіч прапанаваў усім падрыхтаваць свае прапановы ў выглядзе дакладной запіскі Прэзідэнту.

Маштаб гэтай задачы патрабаваў адпаведных рашэнняў урада. Дакладная запіска Прэзідэнту рыхтавалася за подпісам прэм'ер-міністра С.С. Сідоркага. Сяргей Сяргеевіч мне сумленна паказаў, што ў ёй прыведзены ўсе нашы з рэктарам меркаванні: будынак для вучэбных мэт не прыстасаваны, ад яго аддалены асноўныя транспартныя артэрыі і студэнцкія інтэрнаты, кошт яго рэканструкцыі пры завяршэнні будаўніцтва пераўзыдзе затраты на ўзвядзенне новага корпуса на тэрыторыі задуманага кампуса. А пасля таксама паказаў і рэзалюцыю Прэзідэнта: «Завяршэнне будаўніцтва перадаць Міністэрству адукацыі для развіцця матэрыяльнай базы Баранавіцкага ўніверсітэта». І Аляксандр Рыгоравіч быў правы: рэаніміраваць гэтую будоўлю магла б толькі дзяржаўная сістэма, параўнальная з Міністэрствам адукацыі. А ўніверсітэту надзвычай неабходны быў вялікі вучэбны корпус.

Я пасля падумаў, наколькі ўдалым усё ж такі атрымалася прызначэнне рэктарам прафесара Качуркі. Ён «выцягнуў» усе задачы па развіцці ўніверсітэта. Дарэчы, самай цяжкай аказалася кадравая. Універсітэт павінен быць забяспечаны дыпламаванымі спецыялістамі — кандыдатамі і дактарамі навук. Там павінны весціся паўнавартасныя навуковыя даследаванні, інакш гэта ўжо не ўніверсітэт. На момант яго адкрыцця ў Баранавічах было шэсцьдзесят два кандыдаты навук і нават адзін доктар. Колькасць вучоных быццам неблагая, але гэта ж ва ўсім горадзе! Хто ўжо на пенсіі, хто ў канструктарскім бюро, хто ў сярэдняй школе — яны раз'яднаны, гэта не прафесарска-выкладчыцкі калектыў вышэйшай навучальнай установы. У здаровым прадукцыйным стане ўніверсітэт павінен выраблять вучоных ужо са свайго асяроддзя. Збольшага таму і нельга адкрываць універсітэты, па вобразным выказванні Прэзідэнта, у кожнай вёсцы.

Рэктар Качурка пабудаваў для студэнтаў тры сучасныя інтэрнаты і ўсё ж такі стварыў задуманы кампус. А які прыгожы вучэбны корпус атрымаўся з будынка рэабілітацыйнага цэнтра! І рэктар, і выкладчыкі, і студэнты сапраўды ўклалі душу ва ўладкаванне, упарадкаванне. Калі мы з прафесарам Качуркам аглядалі напоўненыя студэнтамі аўдыторыі, лабараторыі, спартыўныя залы, я яму сказаў, што ўніверсітэт ў Баранавічах не саступае ні ў чым еўрапейскім.

Адкрыццё ўніверсітэта ў Баранавічах мела і палітычнае значэнне — гэты горад стаў універсітэцкім! Прыгожыя корпусы ўніверсітэта ўзбагацілі горад, не кажучы ўжо пра яго насычэнне маладой і гарачай студэнцкай энергіяй.

Васіль Іванавіч у рэктарскі корпус краіны ўвайшоў заканамерна і натуральна. Больш за тое, ён сабою ўяўляў своеасаблівы вобраз такога кіраўніка — на трыбуну лішні раз не напрошваўся, па дапамогу ў міністэрства звяртаўся самую разумную, з мясцовым кіраўніцтвам меў добрыя адносіны, унутраныя ўніверсітэцкія праблемы вырашаў сам, у сяброўстве з рэктарамі-калегамі быў ненавязлівы, але надзейны. Качурка. Вымаўляючы гэта прозвішча, мы ўсе ўяўлялі рэктараў такога своеасаблівага класа. Вартых прадстаўнікоў, вартых кіраўнікоў такога ўзроўню.

На рэктарскай пасадзе прафесар Качурка працаваў з 2004 да 2021 года. У адстаўку сышоў па ўзросце. Змяніў яго першы прарэктар дацэнт Аляксандр Мікалаевіч Унсовіч. Баранавіцкі ўніверсітэт за гэтыя гады выйшаў на ўзровень свайго ўзнаўлення.

Пасля адкрыцця Баранавіцкага ўніверсітэта стваралі Палескі ўніверсітэт было ўжо істотна лягчэй. Па-першае, Пінск пасля абласных цэнтраў — адзін з самых вялікіх гарадоў Беларусі, лічыцца неафіцыйнай сталіцай беларускага Палесся. Па-другое, да моманту адкрыцця ўніверсітэта там ужо быў філіял Беларускага эканамічнага ўніверсітэта і дыхтоўна ўладкаваны, высокага прафесійнага ўзроўню Пінскі вышэйшы банкаўскі каледж. Па-трэцяе (а хутчэй, гэта якраз па-першае), у адкрыцці ўніверсітэта на базе каледжа былі актыўна зацікаўлены старшыня праўлення Наыянальнага банка Пётр Пятровіч Пракаповіч і выпускніца гэтага каледжа, старшыня праўлення Беларусбанка Надзея Андрэеўна Ермакова. Пасля адкрыцця ўніверсітэта ў 2006 годзе ён першы час нават фінансаваўся са сродкаў Нацыянальнага банка і яму нават падначальваўся. І гэта былі правільныя падыходы, якія дазволілі разгарнуць матэрыяльную базу ўніверсітэта, пабудаваць прыгожы вучэбны корпус, зрабіць выключна прыгожы стадыён. Пінск стаў універсітэцкім горадам, і гэта яго ўпрыгожыла з усіх бакоў.

Але рэктара для Пінскага ўніверсітэта мы таксама знайшлі... у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Я нязменна прытрымліваўся патрабавання, што кіраўніком універсітэта павінен быць доктар навук. Даў згоду на гэта прызначэнне дэкан эканамічнага факультэта акадэміі, доктар эканамічных навук, прафесар Канстанцін Канстанцінавіч Шабека. І зноў мы не памыліліся! Прафесар Шабека вывеў Палескі ўніверсітэт у шэраг беларускіх ВНУ высокага класа і пры гэтым рабіў сваю працу грунтоўна і паслядоўна. У кагорце беларускіх рэктараў Канстанцін Канстанцінавіч паводзіў сябе сціпла, але быў заўважны і ўсімі прызнаны як прафесіянал. Рэктарам Палескага ўніверсітэта працаваў з першых дзён яго стварэння да 2021 года. Кіраўніцтва ўніверсітэтам перадаў кандыдату біялагічных навук, дацэнту Валерыю Іванавічу Дунаю.

ВНУ Брэсцкага рэгіёна па сваім геаграфічным размяшчэнні, па грунтоўнасці, па трывалаасці ў нечым уяўляюцца мне той ажурнай, але моцнай будаўнічай канструкцыяй, якую для дахаў вынайшлі ў тэхнічным універсітэце рэктара Пойты.

Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.

(Працяг будзе 22 кастрычніка).

Дыялог

«Мне цікава, як расце новае пакаленне»

Аляксандр Радзькоў абмеркаваў з моладдзю важныя пытанні

У Рэспубліканскім доме моладзі прайшоў адкрыты дыялог «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня». Галоўным спікерам быў Аляксандр Радзькоў, грамадскі дзеяч, палітык, педагог, вучоны і лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі.

Сустрэча праходзіла як афлайн, так і анлайн і аб'яднала каля ста чалавек, у тым ліку і актыў рэгіёнаў. У пачатку мерапрыемства Аляксандр Радзькоў выказаў пажаданне, каб гэтая размова была ўзаемна цікавай:

— Мне хацелася б даведацца, што трывожыць моладзь, як яна ўспрымае сённяшнюю сітуацыю ў краіне і свеце, што для яе значыць быць патрыётам, на што яна накіравана, як бачыць будучыню. Мне цікава, як расце новае пакаленне, як думае, з якімі цяжкасцямі сутыкаецца. У сваю чаргу я гатовы падзяліцца вопытам і ведамі, расказаць пра тое, як мы жылі і выходзілі з тых ці іншых сітуацый.

Таксама спікер закрануў тэму таго, як правільна сябе паводзіць у кантэксце цяперашняй сітуацыі ў свеце:

— Трэба найперш пра сябе клапаціцца самім, турбавацца пра будучыню сваёй краіны, сваіх блізкіх. У меншай ступені разлічваць на тое, што хтосьці нам нешта дасць. Жывучы ў гэтым шматпланавым і няпростым свеце, перш за ўсё трэба дабівацца сваіх поспехаў, выконваць сваю работу, прапаноўваць свой тавар і свой розум іншым, але на ўзаемавыгадных умовах, таму што наша гісторыя гаворыць: нам ніколі ніхто нічога не даваў.

Акрамя абмеркавання шэрагу важных пытанняў аб адукацыі, палітыцы і далейшых перспектывах, была таксама прэзентавана кніга «Рэктары».

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

АПОШНЯЕ ПРЫВІТАННЕ МІНУЛАГА ЛЕТА

СОНЕЙКА З ГРАДКІ

Восень — выдатная нагода дадаць у меню сезонныя прадукты, а для сучаснага чалавека — яшчэ і адкрыць для сябе шмат новых (а дакладней, добра забытых старых) смакаў. І выдатны варыянт для пачатку кулінарных эксперыментаў — незаслужана забыты многімі гарбуз.

— Гарбузовыя пірагі, мусы, супы, гарачыя стравы, кашы, салаты, соусы — з гэтай гародніны можна прыгатаваць усё, што заўгодна, — кажа Яўген, шэф-кухар адной са службаў дастаўкі здаровага харчавання. — З гарбуза можна стварыць масу смачных страў. Гэта не толькі супы-пюрэ, кашы ды запяканкі, якія нашы гаспадыні больш ці менш асвоілі і часам уключаюць у рацыён, але і, напрыклад, аладкі і булачкі, гарачыя і халодныя закускі, а таксама — разнастайныя гарбузовыя тарты, не вельмі каларыйныя і пры гэтым вельмі смачныя. Гарбуз выдатна спалучаецца з крупамі, малочнымі прадуктамі, мясам, гароднінай.

Дыетолагі сцвярджаюць: каб пазбегнуць «восеньскай хандры», важна своечасова змяніць летні лёгкі рацыён на правільны восеньскі — больш каларыйны, але з багаццем сезонных «дарункаў прыроды».

На сталічным Камароўскім рынку, трэба сказаць, асартымент гарбузоў нечакана невялікі.

— Попыту асаблівага няма, — гаворыць прадавец Алена. — Не ўсе ўмеюць з яго смачна гатаваць. Але ёсць у мяне пастаянныя пакупнікі, якія прыходзяць па гарбузы да мяне кожную восень.

«Экалагічна чыстыя гарбузы», як адрэкамендавала свой тавар суразмоўніца, яна прадае па 3 рублі 50 капеек за кілаграм. Дэкаратыўныя гарбузікі — па пяць рублёў штучка. Яна кажа, дэкаратыўныя бяруць часцей.

— Хоць можна і вось гэты выкарыстоўваць для прыгажосці, — суразмоўніца паказвае на велізарны аранжавы прыгажун-гарбуз, па выглядзе кілаграм на восем. — Паставіць на кухні, палюбавацца, а потым з'есці.

Алена распавядае, што гандлюе гарбузамі кожную восень.

— Сама вырошчваю, без усякай хіміі. Я ўсё жыццё пражыла ў Мінску. Цяпер на пенсіі, жыву ў вёсцы, займаюся агародам, — тлумачыць яна.

Кажа, што гарбузы — яе любоў і натхненне: падабаюцца — і ўсё. Непатрабавальныя, прыгожыя, і заўсёды добры ўраджай.

— А прыбытку з іх асаблівага няма, — дадае яна.

Вялікія гарбузы ядомых сартоў таннейшыя за маленькія:

— Вялікі аддам па тры рублі за кілаграм. Вось гэты кілаграма на чатыры ўсяго зацягне, па тры рублі палічу, — спакушае мяне Алена. І зноў наракае, што гаспадыні гатаваць гарбуз не ўмеюць, а ён жа дае велізарны прастор для кулінарнай творчасці:

— Гарбуз хоць у кашу, хоць запякаць у духоўцы з мясам або без мяса. Асабіста мне вельмі падабаецца гарбуз ў духоўцы проста са спецыямі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А калі суп-пюрэ з яго зрабіць са сліўкамі — наогул неверагодна смачна!

Гарбуз на стале нашых продкаў — «іншаземец», як і бульба (і, дарэчы, шмат стагоддзяў займаў месца бульбы ў рацыёне славян у тандэме з бручкай). Але ён трапіў у традыцыйнае меню беларусаў значна раней за «другі хлеб». «Прыбыў» гарбуз на тэрыторыю славянскіх паселішчаў у IX—X стагоддзях — яго прывезлі паволжскія хазары. Славяне ацанілі гарбуз: ён мог захоўвацца аж да наступнага ўраджаю, плюс — надаваў стравам лёгкую слодыч. Яго запасалі на зіму, каб дадаваць у кашу і мясныя стравы. І, калі ўжо гаворка зайшла пра бульбу, гарбуз з пункту гледжання здаровага харчавання не ў прыклад больш карысны. Аказваецца, гэта «восеньскае сонейка» — проста скарбніца карысных рэчываў. У яго складзе вітаміны C, PP, E, A, групы B, а таксама F, D і рэдкі вітамін T. Пра яго варта сказаць асабліва, бо ён удзельнічае ў акісленні свабодных тлустых кіслот і спрыяе зніжэнню аб'ёмаў тлушчавай тканіны, а таксама зніжае ўзровень тлушчаў у крыві і таму паказаны пры атэрасклерозе і сардэчна-сасудзістых захворваннях. Акрамя таго, у гарбузе ёсць жалеза, медзь, кобальт, калій, магній, кальцый, ёд, цынк, селен, клятчатка, раслінныя цукры, амінакіслоты. Гарбуз вельмі карысны для жоўцевага пузыра, кішэчніка, страўніка. Дыетолагі называюць гарбуз «суперфудам» нашых шырот. Бо суперфуды — гэта звычайныя, звыклыя прадукты, але з высокай канцэнтрацыяй

Восень — час папесціць сябе і родных гарбузовым торцікам.

калі такі «мячык» трапіць у лоб — будзе шышка!

Дэкаратыўныя гарбузікі надзвычай мілыя — так і хочацца патрымаць іх у руках. Яны бываюць самых розных расфарбовак (ад зялёных да белых, і, вядома, усёй палітры аранжавых і чырвоных тонаў). Есці іх нельга — мякаці амаль няма, а лупіна вельмі цвёрдая. Затое яны захоўваюцца многія гады. Рамеснікі робяць з іх мастацкія кампазіцыі і эфектныя восеньскія букеты — майстар-класаў у сетцы колькі заўгодна, нішто не перашкаджае купіць маленькіх дэкаратыўных

Салат з кораня сельдэрэю — для тонкай таліі.

карысных рэчываў. Зразумела, не варта ўспрымаць іх як панацэю, аднак іх карысць несумненная. Нас акаляе шмат такіх суперкарысных прадуктаў, у прыватнасці той жа гарбуз. Спецыялісты здаровага харчавання сцвярджаюць, што ён проста незаменны ў рацыёне гарадскога жыхара, таму што павышае імунітэт, змагаецца з бяссонніцай і зніжае ўзровень стрэсу. Рэкамендуецца ўключаць гарбуз у лячэбнае меню пры атэрасклерозе і падагры, хваробах мочапалавой сістэмы і — паўторымся — сардэчна-сасудзістых захворваннях, якія, вядома, на першым месцы сярод хвароб сучаснага гарадскога жыхара.

Дэкаратыўныя гарбузы — яе асаблівая любоў, кажа Алена.

— Яшчэ з дзяцінства. Яны раслі ў нас у агародзе, маме калісьці падарыла насенне наша суседка. Памятаю, як яны стаялі ў серванце. Нам дазвалялі з імі гуляць. Праўда, гарбузоў (праўда, яны нятанныя — у сярэднім на рынку 3-5 рублёў за штучку) і дадаць фарбы восені ў інтэр'ер свайго дому. Таксама дэкаратыўныя гатункі гарбузоў часта высаджваюць у якасці ўпрыгожання апусцелых кветнікаў. З імі восеньскі агарод выглядае ўтульным і яркім. У ландшафтным дызайне іх спалучаюць з «познімі» кветкамі (хрызантэмамі, астрамі, віёламі), і каля дому адразу становіцца сонечна, нават калі неба хмурыцца.

ГЛЯДЗІМ У КОРАНЬ

Дыетолагі сцвярджаюць: каб пазбегнуць «восеньскай хандры», важна своечасова змяніць летні лёгкі рацыён на правільны восеньскі — больш каларыйны, але з багаццем сезонных «дарункаў прыроды». У меню аматараў ЗЛЖ такія прадукты, як корань сельдэрэю, корань пятрушкі і пастарнак, увайшлі даўно. Цяпер, на хвалі цікавасці да правільнага харчавання (пасля пандэміі кавіда людзі значна больш уважліва сталі ставіцца да свайго здароўя) «падцягваюцца» і ўсе астатнія.

— Корань сельдэрэю наш, беларускі, вялікі не расце, гэта прывазныя польскія вялікія, — тлумачыць прадавец Ірына. — Па пяць рублёў аддам.

Карысць сельдэрэю (а ў ежу можна ўжываць і карані, і лісце, і сцёблы) цяжка перааценіць. У яго склад уваходзяць эфірны алей, флаваноіды, вітаміны C, A, K, E, групы B, арганічныя кіслоты, жалеза, калій, натрый, магній, фосфар, пекціны, амінакіслоты, раслінныя гармоны. Сцёблы і лісце сельдэрэю ў летняй салаце — звыклы інгрэдыент. А вось корань сельдэрэю пакуль для многіх — экзотыка. Між тым менавіта восенню і менавіта мясцовай вытворчасці яго актыўна рэкамендуюць да ўжывання нутрыцыёлагі. Сельдэрэй аказвае агульнаўмацавальнае дзеянне, нармалізуе дзейнасць стрававальнай і нервовай сістэм, ацаляе ад сасудзістых і сардэчных хвароб, зніжае артэрыяльны ціск. Акрамя таго, умацоўвае імунітэт і нават, па выніках некаторых даследаванняў, з'яўляецца прафілактычным сродкам супраць анкалогіі. І вядома, гэтая расліна вельмі карысная пры пахудзенні. Мінімальная колькасць калорый, вялікая колькасць клятчаткі, здольнасць хутка расшчапляць тлушчы — усё гэта дапамагае пазбавіцца ад залішніх кілаграмаў.

— Корань сельдэрэю можна тушыць, варыць і запякаць, — распавядае суразмоўніца.

Калі вы купілі корань сельдэрэю і яшчэ не ведаеце, як яго ўжываць у ежу, паспрабуйце для пачатку ў сырым выглядзе, раіць яна. Ачысціце, памыйце, здрабніце на буйнай тарцы, пасаліце, запраўце любым смачным алеем (сланечнікавым, рапсавым, аліўкавым) — і пакаштуйце.

— Не, гэта не хрэн. Гэта корань пятрушкі, — папраўляе мяне прадавец. — Прадаю яго на вагу, дзесяць рублёў кілаграм. Яго ў суп. Пастарнак таксама для супу бяруць — з яго вараць суп-пюрэ.

Аказваецца, «саспелы» корань пятрушкі мае лёгкі арэхавы прысмак. Яго ўжываюць у народнай медыцыне — і нядзіўна: гэта ж «жывы» мультывітамінны комплекс (у 50 г цуда-кораня — сутачная норма вітаміну A і аскарбінавай кіслаты), а таксама вітаміны групы B, P, E, PP, K, марганец, калій, кальцый, натрый, магній, фосфар, солі хлору, жалеза, селен, фоліевая кіслата, эфірны алей, флаваноіды, арганічныя кіслоты, клятчатка. Акрамя відавочнага — дадання ў свежыя салаты і ў супы — корань пятрушкі можна, напрыклад, гатаваць у фрыцюры. Атрымліваюцца карысныя «чыпсы», галоўнае — максімальна прыбраць з гатовай стравы алей: выкласці на сурвэтку і даць тлушчу сцячы.

Пастарнак таксама трывала прапісаўся ў восеньскім рацыёне «зожнікаў». Гэты дыетычны прадукт да таго ж аказвае болесуцяшальнае, бактэрыцыднае, заспакаяльнае, лёгкае мачагоннае дзеянне (можна забыцца на прыпухласці пад вачыма раніцай). Медыкі рэкамендуюць уключаць «белую моркву» (яшчэ адна назва пастарнака) у меню хворых на пнеўманію і бранхіт. Караняплод дадаюць у салату і супы, смажаць і запякаюць. Гародніна гэта пакуль у нашых шыротах досыць рэдкая, і прадае яе суразмоўніца па тым жа кошце, што і корань пятрушкі.

З гарбуза можна стварыць масу смачных страў. Гэта не толькі супы-пюрэ, кашы ды запяканкі, якія нашы гаспадыні больш ці менш асвоілі і часам уключаюць у рацыён, але і, напрыклад, аладкі і булачкі, гарачыя і халодныя закускі, а таксама — разнастайныя гарбузовыя тарты, не вельмі каларыйныя і пры гэтым вельмі смачныя. Гарбуз выдатна спалучаецца з крупамі, малочнымі прадуктамі, мясам, гароднінай.

— Купляюць-купляюць! — усміхаецца яна. — І корань сельдэрэю, і корань пятрушкі, і пастарнак. Ёсць аматары. У пастарнаку не надта насычаны пах і ў сырым выглядзе. А пасля цеплавой апрацоўкі ён становіцца і ўвогуле нейтральным па смаку. Вось корань пятрушкі — гэта відавочна менавіта спецыя: не трэба ў страву нічога больш дадаваць, калі любіце пах пятрушкі. Можна і тушыць, і смажыць, і ў суп. А пастарнак — ён проста дае лёгкую, прыемную слодыч.

І напрыканцы — рэцэпт ад шэфкухара Яўгена: сагравальны гарбузовы суп з коранем сельдэрэю.

Спатрэбяцца паўкіло гарбуза, буйная морква і вялікая цыбуліна, чвэрць (або нават палоўка) кораня сельдэрэю і каля 3-4 см кораня імбіру, сталовая лыжка молатага салодкага перцу (папрыкі) і 250—300 мл моцнага курынага булёну. Гарбуз і корань сельдэрэю адвольна (досыць дробна) наразаем, цыбулю і моркву рэжам тонкімі колцамі і пасіруем гародніну да залацістага колеру ў алеі, хвілін 5-6 (лепш у два прыёмы — спярша моркву з цыбуляй, а праз некалькі хвілін дадаём да іх гарбуз і сельдэрэй). У агароднінную смажанку ўсыпаем нацёрты на буйнай тарцы імбір і папрыку. Перакладаем сумесь у рондаль, заліваем булёнам і трымаем на павольным агні каля 20 хвілін. Апошні штрых — надаць супу правільную кансістэнцыю з дапамогай блэндара.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Кіно аб сапраўдных каштоўнасцях

Што рыхтуе гледачам чарговы «Лістапад»

На кінастудыі «Беларусьфільм» адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная XXVIII Мінскаму міжнароднаму кінафестывалю «Лістапад». Арганізатары распавялі аб геаграфіі форуму, гасцях фестывалю і запланаваных мерапрыемствах. Слоган XXVIII «Лістапада» — «Сапраўдныя каштоўнасці». Найбуйнейшы кінафестываль краіны пройдзе з 4 да 11 лістапада.

Адметнасці фестывалю

Сёлета арганізатары атрымалі 1360 заявак з 89 краін, аб гэтым падчас прэс-канферэнцыі распавёў **генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм», дырэктар кінафестывалю Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ.** Па-ранейшаму праграма форуму будзе складацца з ігравога конкурснага кіно, а таксама пазаконкурснага. Так, у межах пазаконкурснага запланавана секцыя кароткага метра маладых кінематаграфістаў Беларусі і Расіі:

— Сёлета вялікі ўхіл будзе зроблены на маладзёжны рух: мы імкнёмся, каб як мага больш моладзі прыняло ўдзел у сустрэчах, адукацыйных семінарах, пітчынгах і праглядах. Мы хочам, каб фестываль быў патрэбны не толькі тым, хто даўно яго любіць, але і тым, хто прыйдзе нам на змену, — адзначыў Уладзімір Карачэўскі.

У межах XXVIII «Лістапада» запланавана правядзенне двух пітчынгаў. Першы будзе прысвечаны студэнцкім работам і дапаможа моладзі падзяліцца цікавымі ідэямі. Таксама для пераможцаў запланаваны прызавы фонд. Другі пітчынг міжнародны, удзел у ім возьмуць прадстаўнікі розных краін, на ім прадстаўляць работы для капрадукцыі і супрацоўніцтва з «Беларусьфільмам».

Таксама ў межах пазаконкурснага кіно запланаваны Дні кіно Расіі, Узбекістана, Індыі, Кітая, Інданезіі. Дырэктар фестывалю дадаў, што яшчэ адной цікавосткай сёлетняга «Лістапада» стане вялікая прэзентацыя беларускага кіно, створанага ў гэтым годзе.

Чаго чакаць ад форуму

У гэтым годзе Беларускі саюз кінематаграфістаў святкуе 60-годдзе. Форум стане выдатнай пляцоўкай для творчых сустрэч, круглых сталоў і майстар-класаў. Саюз кінематаграфістаў, які таксама з'яўляецца заснавальнікам «Лістапада», запрасіў калег з Арменіі, Грузіі, Кыргызстана і Малдовы. Старшыня саюза кінематаграфістаў Віктар Васільеў распавёў, што сустрэцца з гасцямі можна будзе ў Акадэміі мастацтваў, а таксама на іншых пляцоўках, у тым ліку і ў рэгіёнах краіны.

Старшыня XXVIII «Лістапада» народны артыст Беларусі Аляксандр ЯФРЭМАЎ адзначыў, што сёлетні форум стане асаблівым:

— Спадзяюся, што фестываль будзе адрознівацца ад папярэдніх. Упершыню такая вялікая колькасць краін падалі заяўкі на ўдзел. Чакаецца вельмі цікавая, эфектыўная работа на экранах. Зараз глядач чакае герояў, якія пражываюць шчаслівае жыццё. Глядач жадае, каб кінематограф надаў упэўненасці і прагі жыць. Спадзяюся, што ўся праграма фестывалю будзе прысвечана нашаму гледачу і пераканаванню, што жыццё цудоўнае.

Дзе можна паглядзець кіно

У сталіцы месцы правядзення фестывалю застануцца нязменнымі, аб гэтым паведаміў **начальнік управлення культуры Мінгарвыканкама Віталь БРЭЛЬ.** Цырымоніі ўрачыстага адкрыцця і закрыцця форуму пройдуць у кінатэатры «Масква». Таксама будуць задзейнічаны пляцоўкі кінатэатраў «Беларусь» і «Цэнтральны». А ў «Піянеры» адбудзецца паказ дзіцячага і дакументальнага кіно.

Арына КАРПОВІЧ.

ЛАЎЦЫ ПУЛЬСАЦЫЙ

Як Сімяон Полацкі змяняў гараскоп цара і што Дубоўка ведаў пра Чарнобыль?

Літаратуразнаўца і загадчык кафедры Гомельскага ўніверсітэта Іван ШТЭЙНЕР вырашыў развітацца са словам — тым, якое мы называем бессмяротным. Але прафесар Штэйнер напісаў кнігу «Пахвала слову, што сыходзіць» — дык няўжо ставіць пад сумнеў яго вечнае жыццё? Прытым, што сам — пісьменнік... Нейкі тут падвох. Альбо хітрая правакацыя? Насамрэч шмат пытанняў наконт будучыні тых, хто піша і чытае. Чым каштоўная літаратура наогул і беларуская ў прыватнасці? Чаму творы мінулага адгукаюцца сёння? Што можа даць прыгожаму пісьменству сучаснасць? Бываюць размовы, пасля якіх усе пытанні хочацца адкінуць, засяродзіўшыся на тым, што аднолькава турбуе і яднае з суразмоўцам: ці захаваецца наша кніжная цывілізацыя?

— Глебу для напісання кнігі мне дала сусветная літаратура, перш за ўсё еўрапейская, — гаворыць Іван Федаравіч. — Я звяртаюся да формы панегірыка — пахвалы. Раней было так, што калі заслужаны чалавек паміраў, то над ім павінны былі выступаць з пахвальным словам. Я выкарыстоўваю такую метафару невыпадкова: часта даводзіцца чуць, што надышоў канец літаратуры, нам трэба сказаць ёй «дзякуй» і паставіць кропку на яе развіцці. Бо эпоха Гутэнберга, якая пачалася ў 1456 годзе, завяршаецца. Гэта была эпоха слова...

А ў Індыі здаўна лічылі, што Сусвет утварыўся з аднаго гуку. Гэта вібрацыя, якая спараджае ўсё, нават багоў. Егіпецкая Кніга мёртвых — гэта пралог таго, як слова можа кіраваць чалавечай душой. У хрысціянскім свеце роля слова выключная. Нават калі чалавек пакідаў свет, над ім чыталі Псалтыр, а над святарамі — Евангелле, бо лічылася, што гэта словы, дадзеныя самім Стваральнікам. Калі Іаан Багаслоў на востраве Патмас сядзеў адрэзаны ад свету, то быццам прымаў энергію звыш, пераводзячы яе ў словы Апакаліпсіса. Пасля Марцін Лютэр пісаў, што, калі бачыў «Біблію», у яго ліліся слёзы. Па сутнасці, тэзісы, якія ён у 1517 годзе прыбіў да храма, перавярнулі ўсю Еўропу і нават свет. У гэтым дапамог Гутэнберг, які зрабіў кнігу даступнай.

Але ў пэўны перыяд чалавечай гісторыі слова заваявала ўвесь свет — гэтаму паспрыялі эпохі Асветніцтва і Рамантыкі. Карл Шлегель пісаў: чым людзі ёсць у адносінах да жывёл, так і пісьменнікі ў адносінах да іншых людзей. А той, хто валодае словам, па сутнасці, кіруе светам. Але што гэта —

дар ці пакаранне?

— Апостал Павел піша пра тое, як нейкі чалавек быў дапушчаны да трэцяга неба, чуў там дзіўныя словы — і не разумеў іх. А колькі яшчэ тых нябёсаў і таямніц! Дапускаюць да іх зрэдку якраз паэтаў. Некалі Адам Міцкевіч у паэме «Пан Тадэвуш» пісаў пра непраходныя беларускія пушчы: туды ніхто патрапіць не можа, а толькі ведзьма, якая варыць грэшнікаў. І паэты — яны дапушчаны да таямніцы спасіжэння жыцця. Як Пясняр з паэмы Янкі Купалы — нібыта медыум паміж найвышэйшымі сіламі і зямлёй, за што прымае пакуты.

Я разважаю пра тое, што прымушае чалавека пісаць. Калісьці быў стымул — атрымаць грошы, палепшыць матэрыяльнае становішча. Але далёка не ва ўсе часы і не для ўсіх. У студэнтаў часам пытаю: «Якую прэмію атрымаў Тарас Шаўчэнка за зборнік «Кабзар»? — «Ленінскую», «Сталінскую»... Згадваем гады жыцця і разумеем: ён атрымаў дзесяць гадоў салдатчыны. Але не мог не ствараць.

Раней лічылі, што той, хто звязаны са словам, валодае дарам, які можа ўздзейнічаць на іншых. І кіраваліся гэтым. Сімяон Полацкі наогул імкнуўся словам затрымаць нараджэнне дзіцяці, каб змяніць гараскоп і лёс будучага цара. Магія слоў — не заўсёды метафара, асабліва калі гаворка пра народную культуру. У сваім родным сяле ведаю тых, хто звяртаўся да бабак-шаптух, якія прамаўлялі пэўныя словы, — і хваробы адыходзілі. У Аляксандра Блока ёсць магутны твор пра замовы. А ў даследаванні Аляксандра Афанасьева «Паэтычныя погляды славян на прыроду» гаворыцца, што людзі здаўна ўспрымалі гэта натуральна, як частку жыцця. Слова можа аб'ядноўваць і сілкаваць.

Калі «Іліяду» прачытаў археолаг Шліман, то разумеў, дзе трэба капаць, — так знайшлі Трою. Герадот, якога лічаць пачынальнікам гісторыі, здаецца, апісваў нерэальныя з'явы. Нібыта ў пойме Дняпра жыве племя вендаў, якія могуць ператварацца ў ваўкоў. А мы ў Беларусі сёння можам назваць нават імя чалавека, якога надзялялі такімі здольнасцямі... Так, літаратура вывучала жыццё і адначасова захоўвала веды. А калі сёння мы чагосьці не разумеем, то, можа быць, з-за таго, што страчана сувязь паміж часамі. Бо як тады пісьменнікі маглі

прадбачыць будучыню?

— Напрыклад, Джонатан Свіфт у «Прыгодах Гулівера» расказаў пра два спадарожнікі Марса, а іх адкрылі толькі праз 100 гадоў! Жуль Верн першы апісаў, як здзяйснялі падарожжа на Месяц, а пасля вярнуліся і на парашутах упалі ў Ціхі акіян, як цяпер гэта робяць. Марк Твен, які нарадзіўся ў той год, калі прыляцела камета Галея, казаў, што памрэ, калі яна вернецца. І ў нас свае прадказальнікі былі. Фадзей Булгарын у 1829 пісаў пра свет у XX стагоддзі. Ён прадказаў, што Індыя стане незалежнай, Кітай разрасцецца, Штаты ўмацуюцца, а Еўропа згасне. Паэт і геолаг Міхаіла Грамыка амаль 100 гадоў таму падказаў, дзе ў Беларусі трэба шукаць нафту: каля Рэчыцы ёсць вёска Гарывада. І знайшлі!.. Як, калі не прароцтвам у вершы Уладзіміра Дубоўкі «О, Беларусь, мая шыпшына» мы можам успрымаць словы «...Чарнобылем не зарасцеш»?.. А Караткевіч у 1955 годзе напісаў верш «Дзяўчына пад дажджом», у якім радасць змяняецца жудасным разуменнем, што ў цёплых кроплях быў стронцый...

Чаму паэтаў называюць прарокамі? Іх адчуванні не толькі за сябе, а за свой народ. Калі Янка Купала ў Санкт-Пецярбургу атрымаў вестку, што ў Кіеве на 20-м годзе жыцця вырашыў сысці з жыцця Сяргей Палуян, то некалькі дзён хадзіў у трансе, нібыта бачыў праз адлегласць, як над магілай вырастае бугарок, з якога ўтвараецца курган — не толькі над паэтам, а над усімі пісьменнікамі Беларусі, якія загінулі. А потым ён напіша «На куццю», пра княскі баль, дзе людзі — мёртвыя, але ёсць момант, калі яны могуць выйсці з нябыту. Такім чынам ён прадказаў гісторыю беларусаў.Таму бюст Купалы ёсць у парку пад Нью-Ёркам разам з помнікамі Пушкіну і Шаўчэнку — яны сімвалы славянскіх літаратур, якія найбольш дасканала ўвасобілі народную душу. Можна казаць пра тое, што слова стварыла беларускую культуру і беларускую дзяржаўнасць. Ёсць у гэтым заслуга нашых класікаў. Яны паказалі, што літаратура можа разам з людам радавацца, плакаць, узняць на барацьбу, уславіць.

У XX стагоддзі яшчэ думалі, што так яна і будзе развівацца. Але Рыгор Семашкевіч амаль 50 гадоў таму ў аповесці «Бацька ў калаўроце» папярэджваў: напачатку ў слове была магутная энергія, але яе размянялі на дробязі.

Няўжо эпоху славеснасці зменіць...

эпоха бясслоўнасці?

— Лічбавая цывілізацыя адкрывае магчымасці абыходзіцца без друкаванага слова. Таму і літаратура будзе мяняцца знешне, структуральна. Мала хто цяпер чытае вялікія раманы. Мой зямляк Юрый Алеша ў 1950-я гады папярэджваў, што так здарыцца, таму трэба шукаць новыя формы ўвасаблення, бо, як адышлі старажытныя жанры, так і адыдуць маштабныя жанры, у першую чаргу раман-эпапея. Раней прозаік не лічыўся салідным, калі ў яго не было раманаў. Цяпер да іх звяртаюцца, каб зрабіць сцэнарый меладрамы ці блакбастара. А сучасны раман можа складацца з раздзелаў, падобных на смс-ку. Мы назіраем, як мяняецца носьбіт, адпаведна, павінны мяняцца і формы літаратуры. Гэта не кепска і не страшна — гэта інакш. І гэта не адмяняе разумення важкасці слова.

Вось згадаем прыпавесці Хрыстовы ў Евангеллі. Хрыстос размаўляў прыпавесцямі, каб людзі лепш зразумелі, ім былі патрэбныя прыклады. Потым на іх падставе пісьменнікі будавалі раманы — згадаем Томаса Мана, Оскара Уайльда і г. д. Нават у назвах спасылаліся на Біблію — як Вячаслаў Адамчык у рамане «Голас крыві брата твайго». А зараз адваротная тэндэнцыя — калі кароткa даецца сутнасць, як у прыпавесцях Хрыстовых. Фактычна мы вяртаемся да выключнай мудрасці праз скарачэнне.

Разумныя і таленавітыя пісьменнікі гэта адчулі натуральным чынам. У «карацельках» выдатна раскрыўся Янка Брыль. Ды Алесь Разанаў казаў, што тэкст павінен змяшчацца максімум на адной старонцы. І згадваў паданне пра кітайскага філосафа, які доўга думаў, а потым пакінуў пусты ліст. Сімвал змястоўнасці — як чорны квадрат Малевіча для мастацтва, так і белы аркуш паперы для літаратуры.

Калі паглядзець на творчасць Разанава — у яго наогул з'явілася тое, што яшчэ не было ўласціва сусветнай літаратуры. Напрыдумваў нейкіх квантэм, пісаў пункціры... Некаторым здавалася, што ў яго проста набор слоў. Але калі паглыбіцца, то зразумела, што ён перадаваў сутнасць, паказваў, чым гэтае ці іншае слова асаблівае, як павінна гучаць, што нясе. Так мы вяртаемся да тэорыі вялікага выбуху, толькі слова ўжо прайшло па коле і вярнулася да сваіх вытокаў у імпульсіўным выглядзе... Магчыма, нам прыйдзецца шукаць спосаб, як да энергетычных плыняў

далучыць чалавека?

— Ёсць тут задача і для літаратуразнаўства. Яго магчымасці цяпер пашыраюцца. Узнікла кампаратывістыка, у некаторых краінах нават адкрылі такую спецыяльнасць, каб зразумець, якое месца займае нацыянальная літаратура ў агульначалавечым кантэксце. Наогул, нацыянальная літаратура не можа развівацца ізалявана, але ў сілавым полі сусветнай культуры.

Наша даследчыца Вольга Ліздзянкова вывучае беларускі гістарычны раман у супастаўленні з англійскім. Яна адзначае, што нават вялікім літаратурам цяпер уласцівыя перажыванні з-за таго, што людзі забываюць сваю культуру, традыцыі. У Англіі зараз ідзе зварот да асобы Генрыха VIII, згадваюць усіх яго жонак, здымаюць гістарычныя серыялы, каб абудзіць цікавасць да гісторыі. І ў нас апошнім часам назіраюцца харошыя тэндэнцыі: напісалі пра мастачку Алену Кіш, пра Язэпа Драздовіча. А маладыя літаратары і даследчыкі літаратуры цяпер ведаюць шмат моў, сочаць за сусветным працэсам, пераймаюць нейкія тэндэнцыі, праўда, даволі крытычна — мы не былі жабракамі і, спадзяюся, не будзем.

Наогул, ніхто наперад не ведае, дзе выскачыць штосьці незвычайнае і з'явіцца цікавыя тэмы і новыя формы. Алесь Адамовіч прыдумаў запісваць жывы факт, і сумесна з Янкам Брылём і Уладзімірам Калеснікам яны падрыхтавалі кнігу «Я з вогненнай вёскі». А пасля Адамовіч працаваў над ваеннымі гісторыямі разам з Данііламі Граніным, дык прызнаваўся, што матэрыял моцна рэзалі, пры тым, што яны і самі многае апускалі: каб запісалі ўсё, то страцілі б веру ў чалавека... Такая з'ява як дакументалізм — заслуга беларускай літаратуры. Аднак Васіля Быкава да гэтай справы не далучылі, не зважаюць на агульнасць тэмы: яму трэба было ісці сваім шляхам, раскрываючы псіхалогію чалавека на вайне, — гэта не менш важна, чым дакументальнае сведчанне вялікай бяды, урокі якой павінна было засвоіць чалавецтва.

Надрукаванаму слову трэба сказаць «дзякуй» менавіта за тое, што ў пэўныя часы не дазволіла чалавецтву вярнуцца ў дзікунства. У наш прасунуты час мы наіўна думаем, што такой небяспекі няма. Але ад яе не застрахуюць тэхналогіі самі па сабе, а толькі розум і здаровы сэнс, які прыйдзецца так ці інакш захоўваць і даносіць. Каб бясслоўная эпоха не стала бясслаўнай.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Правила проведения Рекламной игры

«ОБРАЗ ИЩЕТ ТЕБЯ»

Настоящие правила проведения Рекламной игры «Образ ищет тебя» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Образ ищет тебя» (далее – Рекламная игра).

1. Организатор Рекламной игры.

Организатором Рекламной игры является ООО «Хэппи Нейшен», Республика Беларусь, 220004, г.Минск, ул. Кальварийская, 21/5-1, 2-й этаж, УНП 190871314, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 27 сентября 2007 года, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190871314.

2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является ЗАО «МТБанк», 220007, г. Минск, ул. Толстого, 10, УНП 100394906.

3. Наименование Рекламной игры: «Образ ищет тебя».

4. Территория проведения Рекламной игры: Республика Беларусь.

5. Срок начала Рекламной игры: 17.10.2022.

6. Срок окончания Рекламной игры: 29.12.2022.

7. Участники Рекламной игры.

К участию в Рекламной игре приглашаются физические лица, держатели банковских платежных карточек, выпущенных на условиях Тарифных планов «Карта рассрочки № 1 «Халва», «Карта рассрочки №1 «Халва-Партнер», «Карта рассрочки № 1 «Халва MIX», «Карта рассрочки № 1 «Халва MAX» (далее – банковские платежные карточки «Халва»), эмитированных ЗАО «МТБанк», достигшие 18 лет – граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, в том числе имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены комиссии по проведению Рекламной игры, а также лицо, состоящее в трудовых отношениях с Заинтересованным лицом.

8. Наименование товаров (работ, услуг), в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.

Рекламная игра проводится в целях стимулирования совершения безналичных операций оплаты товаров (работ, услуг) за счет лимита овердрафта физическими лицами с использованием банковских платежных карточек «Халва», эмитированных ЗАО «МТБанк.

8.1. При использовании в Правилах термин «**карточка**» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

9. Призовой фонд Рекламной игры.

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Заинтересованного лица в размере **8 134,71 (восемь тысяч сто тридцать четыре) белорусских рубля 71 копейка.** Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры.

№	Наименование	Кол-во, шт.	Стоимость за ед., бел. рублей	Всего, бел. рублей
1	Сертификат на услуги по подбору одежды. Срок действия – до 01.03.2023	3	380,00	1 140,00
	Денежные средства		2 331,57	6 994,71
ИТОГО				**8 134,71**

10. Порядок участия в Рекламной игре.

10.1. Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 00.00.00 17.10.2022 по 23.59.59 17.11.2022 включительно (далее – Период участия) выполнить следующие действия (последовательность может быть в любом порядке):

10.1.1. Являться или стать держателем банковской платежной карточки «Халва», эмитированной ЗАО «МТБанк»;

10.1.2. Зарегистрироваться на интернет-сайте https://www.mtbank.by/promotions_live/halva-fashion (далее – Сайт), заполнив на русском языке регистрационную форму, содержащую следующие Персональные данные:

- фамилию (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, при наличии) держателя банковской платежной карточки «Халва»;

- абонентский номер мобильного телефона в международном формате, который указан в момент регистрации Участника в информационной системе ЗАО «МТБанк» (далее – Банк) (номер, указанный физическим лицом при оформлении банковской платежной карточки «Халва», либо номер, измененный в информационной системе Банка в последующем по заявлению физического лица) (далее – «номер телефона Участника») (обязательно);

- адрес электронной почты Участника (обязательно).

Также Участнику необходимо подтвердить согласие на участие в Рекламной игре, ознакомление с настоящими Правилами, а также подтвердить согласие на обработку своих Персональных данных и информации, составляющей банковскую тайну, на Сайте, путем проставления соответствующих отметок при заполнении регистрационной формы;

10.1.3. Совершить не менее одной безналичной операции по оплате товаров (работ, услуг) с использованием банковской платежной карточки «Халва» либо ее реквизитов в организациях торговли (сервиса), за счет лимита овердрафта (далее – безналичная операция) на сумму не менее 30,00 (тридцати) белорусских рублей.

10.2. Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное число раз, совершая новые безналичные операции, согласно п.10.1.3 настоящих Правил.

10.3. Каждая уникальная безналичная операция на сумму не менее 30,00 (тридцати) белорусских рублей, совершенная в соответствии с настоящими Правилами, участвует в розыгрыше призов.

10.4. Участнику присваивается один Номер участника для розыгрыша призов за каждые 30,00 (тридцать) белорусских рублей безналичной операции, соответствующей п. 10.1.3 настоящих Правил, а также совершенной в Период участия. То есть Участнику, совершившему безналичную операцию на сумму 60,00 (шестьдесят) белорусских рублей, будет присвоено 2 (два) Номера участника для розыгрыша призов.

10.5. Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участником при вводе Персональных данных при регистрации на Сайте. При несовпадении Персональных данных, указанных при регистрации на Сайте, с данными, которые указаны в момент регистрации Участника в информационной системе Банка, Участник не допускается к участию в розыгрыше призов.

10.6. Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных безналичных операций Участниками Рекламной игры, в том числе обратиться к Заинтересованному лицу в целях проверки безналичных операций, участвующих в Рекламной игре.

11. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры:

Розыгрыш призов проходит по адресу: Республика Беларусь, город Минск, ул. Бядули 11, в соответствии с датой и временем, указанными в Таблице 2.

Розыгрыш призов проводится открыто, с возможностью присутствия Участников Рекламной игры.

11.1. Розыгрыш призов проводится согласно следующему графику:

Таблица № 2. Розыгрыш призов:

Дата и время розыгрыша	Период регистрации Участника на Сайте	Период совершения безналичной операции	Призы для розыгрыша
30.11.2022 14.00	с 00.00.00 17.10.2022 по 23.59.59 17.11.2022	с 00.00.00 17.10.2022 по 23.59.59 17.11.2022	Приз – 3 шт.

11.2. Для осуществления розыгрыша призов Организатор формирует список для розыгрыша призов (далее – Список), в котором за каждые 30,00 (тридцать) белорусских рублей безналичных операций, соответствующих Правилам, присваивает Номера участника для розыгрыша призов в хронологическом порядке согласно дате и времени совершения безналичной операции. В случае совпадения у нескольких Участников даты и времени совершения безналичных операций, Номера участника присваиваются по фамилии, имени и отчеству (при наличии) Участника по алфавиту.

Все Номера участника для розыгрыша призов имеют одинаковую разрядность.

11.2.1. Список содержит следующую информацию: Номер участника, фамилию, имя, отчество (при наличии) Участника, адрес электронной почты Участника, номер телефона Участника, дату и время совершения безналичной операции, сумму безналичной операции.

11.3. Для проведения розыгрыша Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) до 9 (девяти). Определение выигрышных Номеров участника происходит путем их формирования слева направо из цифр на шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

11.3.1. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного Номера участника Организатор помещает в лототрон шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку Номера участника в Списке. Организатор извлекает из лототрона один шар. Цифра вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного Номера участника.

11.3.2. После этого в лототрон загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному Списку Номеров участника в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного Номера участника. Номер шара вносится в протокол. Таким образом, формируются все выигрышные Номера участников Победителей призов.

11.4. Участник может стать Победителем только один раз. В случае если выигрышный Номер участника, определенный согласно 11.3 Правил принадлежит Участнику, который уже стал Победителем, то Организатор определяет выигрышным следующий Номер участника в Списке, принадлежащий иному Участнику.

11.5. При проведении розыгрыша, после определения Победителей, Организатор дополнительно определяет по одному резервному Победителю для каждого приза. Резервным Победителем становится следующий за выигрышным по Списку Номер участника, принадлежащий другому Участнику, не являющемуся Победителем розыгрыша.

11.6. Результат розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, который подписывается присутствующими на заседании членами комиссии по проведению Рекламной игры.

12. Порядок уведомления Победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрышей.

12.1. Организатор уведомляет Победителей о выигрыше звонком по номеру телефона не позднее 05.12.2022, а также дополнительно может известить Победителей письмом по электронной почте не позднее 09.12.2022.

